КАВУН БЕЛАРУСКАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ 4

ЦІ ЁСЦЬ ТУРЫЗМ ПАДЧАС ПАНДЭМІІ? 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 ЖНІЎНЯ 2020 г. СУБОТА № 163 (29277)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:

«Пандэмія падказала: трэба паскарацца ў пытаннях дыстанцыйнага навучання. І зараз мы актыўна працуем над адзінай адукацыйнай платформай, якая павінна быць прэзентаваная да канца гэтага каляндарнага года. У выніку мы павінны атрымаць платформу, якая будзе працаваць незалежна ад функцыянавання школы. Плануецца, што поўнамаштабна яна запрацуе з наступнага навучальнага года. Дзеці хварэлі і да пандэміі, па розных прычынах прапускалі заняткі. Платформа дазволіць дзіцяці паглядзець тыя ўрокі, якія праходзяць школьнікі ў пэўны момант».

Цыбулька колеру сонца

На падворку сям'і БАЗІЛЬЧУКОЎ з вёскі Галава Шаркаўшчынскага раёна, як і ва ўсіх іх аднавяскоўцаў, поўным ходам ідзе жнівеньская ўраджайная кампанія. Цяпер гаспадыня Алена з меншымі дочкамі Валянцінай і Кацярынай робяць вязанкі цыбулі, на чарзе — копка бульбы, закатка памідораў і варэння, нарыхтоўка і марынаванне грыбоў... Вядома, на сялянскім падворку работы заўсёды хапае, асабліва жнівеньскай парой, калі спеюць садавіна і агародніна. Валянціна — студэнтка, будучы тэхнік лясной гаспадаркі, вучыцца ў Полацкім лясным каледжы, Кацярына перайшла ў дзявяты клас базавай школы. У дзяўчынак працягваюцца канікулы, але яны — першыя памочніцы бацькам па гаспадарцы.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРОТКА

- **Больш за 24,5 тысячы чалавек падалі заявы ў ССНУ на бюджэт, 12 тысяч — на платнае.**
- Наглядальны савет Беларусбанка ўзначаліў Дзмітрый Крутой.
- **Беларускія ваенныя правядуць комплекснае тактычнае вучэнне на гродзенскім напрамку.**
- У Беларусі ў І паўгоддзі ўвялі ў эксплуатацыю 612 кіламетраў газаправодаў.
- **Генпракуратура прапануе ўвесці ў КаАП пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ.**
- Фестываль народных промыслаў і рамёстваў збярэ ў Краснаполлі майстроў Магілёўскай вобласці.
- **Больш за траціну продажаў сельгаспрадукцыі праз БУТБ прыйшлося на шрот алейных.**

Рынак працы

КІРМАШ ВАКАНСІЙ У РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

У Магілёве адбыўся электронны кірмаш вакансій, дзе ўсе ахвотныя памяняць або знайсці работу маглі азнаёміцца з прапановамі прадпрыемстваў і арганізацый. Абмяняцца меркаваннямі з работадаўцамі і адправіць сваё рэзюмэ можна было на электроннай платформе дзяржаўнай службы занятасці.

— Такая форма работы практыкуецца ўжо некалькі месяцаў, яна была ўкаранёная ў сувязі са складанай эпідэміялагічнай абстаноўкай, — кажа **першы намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага гарвыканкама Марыя ШАПНЕЎСКАЯ.** — Прынцып дзеяння такі: спачатку на сайце анансуецца дата правядзення кірмашу, а ў прызначаны час актывізуецца інфармацыя па наймальніках і вакансіях. Колькасць наведванняў сайта залежыць ад колькасці арганізацый-удзельнікаў. Калі мы арганізоўваем вялікі кірмаш вакансій, у якім удзельнічае 30—40 прадпрыемстваў, адпаведна і людзей збіраецца больш. У цэлым жа звярталася ад 200 да 500 чалавек. Праводзілі таксама і міні-кірмашы па нейкай асобнай галіне.

СТАР. 4

Памяць

Унучка знайшла месца, дзе расстралялі яе дзеда

Марына Кальчыба аднавіла імёны некалькіх дзясяткаў рэпрэсаваных землякоў і стала ініцыятарам установкі помніка загінулым беларусам на Салаўках

Жыхарка Чэрыкава Марына Кальчыба — чалавек моцнай веры і вялікага сумлення. Напэўна, гэта і дапамагло ёй выйсці на след расстралянага на Салаўках дзеда Івана Кальчыбы, а заадно высветліць, што ён не быў здраднікам. Неверагоднае ў гэтай гісторыі тое, што сям'я нічога, акрамя таго, што яго расстралялі па прысудзе ваеннага трыбунала, не ведала. І шанцаў знайсці за што і дзе амаль не існавала. Але Марына неверагодным чынам не толькі выйшла на канкрэтнае месца расстрэлу і пахавання дзеда, але нават цалкам аднавіла ўвесь ланцужок трагічных падзей амаль 80-гадовай даўніны.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Я хачу захаваць мір і спакой для тых, хто хоча працаваць»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пабываў на агракамбінаце «Дзяржынскі» ў Мінскай вобласці

Агракамбінат «Дзяржынскі» — адзін з паспяховых комплексаў Мінскай вобласці. За сем месяцаў гэтага года тэмп росту валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі на прадпрыемстве да аналагічнага перыяду мінулага года склаў 104,8 %. Экспарт агракамбіната перасягнуў 20 мільёнаў долараў. Цяпер будуюцца тры малочнатаварныя фермы, некалькі птушкагадоўчых аб'ектаў, птушнікі, вытворчасць па гадоўлі і перапрацоўцы мяса індычкі.

Прыбыўшы на прадпрыемства, як перадае прэс-служба Прэзідэнта, кіраўнік дзяржавы ў першую чаргу пацікавіўся колькасцю супрацоўнікаў і ці ёсць сярод калектыву ахвотныя баставаць. Сярод чатырох тысяч работнікаў пратэстуючых няма. Паводле слоў Прэзідэнта, такія аграхолдынгі павінны быць лакаматывамі ў сельскай гаспадарцы, бо яны падцягваюць іншыя, больш дробныя і слабыя гаспадаркі.

Падчас дакладаў размова перш за ўсё пайшла пра ўборачную кампанію. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван Крупко паведаміў, што ў краіне ўбраны 91 % плошчаў, ураджай збожжа ўжо дасягнуў амаль 7,5 мільёна тон. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што цяпер важна своечасова пачаць пасяўную кампанію.

У цэхах прадпрыемства ён азнаёміўся з вытворчымі працэсамі і сустрэўся з работнікамі агракамбіната, прадзгуставаў розныя віды мясной прадукцыі.

«У свой час вашы начальнікі вельмі прасілі пэўнай падтрымкі і дапамогі, асабліва дадатковых зямельных рэсурсаў, каб можна было вырошчваць дастатковую колькасць кармоў. Рашэнні былі прыняты. Я ўжо гляджу, вы замахнуліся на палову вобласці, а заўтра ўсю краіну манапалізуеце, — адзначыў Прэзідэнт. — За апошнія гады вы і па зарплаце прыраслі, сёння вырабляеце велізарную колькасць прадукцыі. Але самае галоўнае, што ваша прадукцыя карыстаецца попытам».

Перад наведваннем прадпрыемства Прэзідэнт сустрэўся з кіраўнікамі праваахоўных структур, абмеркаваў з імі пытанні падтрымання правапарадку ўнутры краіны і рэагавання на знешнія пагрозы. «Яны кожны дзень з раніцы да ночы дзяжураць, каб захаваць мір і спакой. І я ўбачыў, што хлопцы сваю краіну нікому не збіраюцца аддаваць», — заявіў кіраўнік дзяржавы ўжо на агракамбінаце.

Прэзідэнт сустрэўся і з працаўнікамі агракамбіната. Ён зноў нагадаў, што краіну не трэба бурыць і «гэта мы дазволіць не можам, бо ведаем, чаго яна нам каштавала».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што сітуацыя ў краіне вельмі палітызаваная, але не катастрафічная. «У Мінску, яшчэ недзе, камусьці не падабаецца. Гэта натуральна. Але гэта не павінна вас хваляваць, гэта мая праблема, якую я павінен вырашаць, і мы яе вырашаем. І, паверце, у найбліжэйшыя дні вырашым», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт выказаў свае думкі адносна падзей у Беларусі, а таксама пра ролю ў гэтых працэсах іншых краін. «Нам рыхтавалі гэтую вось заварушку. І Расія баялася нас страціць. Захад нас неяк падцягнуць вырашыў, вядома ж, як мы бачым цяпер, супраць Расіі. Цяпер яны хочуць усталяваць гэты балтачарнаморскі калідор, санітарны кардон — тры балтыйскія рэспублікі, мы і Украіна. Мы тут адно звяно засталіся», — сказаў ён.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, невыпадкова, калі пры такой сітуацыі ў нашай краіне побач пачалі лязгаць гусеніцамі, перамяшчаць танкі. Ён канстатаваў, што камусьці ў Беларусі заплацілі, камусьці задурылі галаву, і пачалася наступная валакіта. «А за мяжой у гэты час вучэнні праводзяць. Што гэта такое? Гэта рыхтуюць пры неабходнасці ўварванне», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што загадзя бачыў задумы сваіх апанентаў

Фота Бел ТА.

і тых, хто за імі стаіць. На яго думку на эмоцыях праскочыць не ўдалося, і ён іх усіх раскусіў загадзя. Аляксандр Лукашэнка паведаміў: спачатку патрабавалі пераліку галасоў, але хутка адмовіліся ад гэтай ідэі і сталі патрабаваць новых выбараў. «Кажуць, пойдзем на новыя выбары. Вы разумееце, што такое яшчэ паўгода займацца гэтымі справамі? Перавярнуць усё ўверх дном, нават рабочым некаторым мазгі запудрылі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падзяліўся сваімі планамі — паляцець на Гродзеншчыну інспектаваць вайскоўцаў, якіх перакінуць на заходні напрамак. «Таму што яны паставілі мэту перш за ўсё гэтую тэрыторыю адсекчы — гродзенскую. Ужо польскія сцягі вывесілі нядаўна, — адзначыў Прэзідэнт. — Зараз Айчына ў небяспецы. Мы не можам жартаваць. Тым больш гэта не слабыя войскі — НАТА. Таму я папярэдзіў Прэзідэнта Расіі аб сітуацыі, якая складваецца ў Беларусі. У нас поўнае паразуменне, у нас ёсць дамова адпаведна ў рамках АДКБ і Саюзнай дзяржавы».

Такім чынам, канстатаваў ён, у сітуацыі, якая склалася, ёсць як знешні, так і ўнутраны фактары. «У той жа час я хачу захаваць мір і спакой для тых, хто хоча працаваць. Я не хачу ўвесці краіну, целкам яе перавесці на ваеннае становішча. Гэта ненармальна. Я хачу, каб спакойна жылі, як гэта было заўсёды», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым лідараў заходніх краін кіраўнік дзяржавы заклікаў перш за ўсё звярнуць увагу на сітуацыю ў сваіх дзяржавах. «Чаму яны заклапаціліся Беларуссю — гэта зручны выпадак адвесці ўвагу ад сваіх праблем. Мы гэта бачым», — заявіў ён.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, прапанова разгледзець беларускае пытанне на пляцоўцы АБСЕ стане магчымасцю навязаць заходняму боку сваю ініцыятыву. Ён заявіў, што супраць Беларусі дзейнічаюць некалькі «ўрадаў у выгнанні»: прэтэндэнта на пасаду кіраўніка дзяржавы Валерыя Цапкалы, які робіць заявы з Варшавы, Святланы Ціханоўскай, што ў Літве.

«Яна нармальная жанчына, любіць сваіх дзяцей. Але яе кінулі на папялішча, і яна сёння топчацца па гэтых галавешках. Яе заблыталі, агарнула Міністэрства замежных спраў Літвы, спецслужбы, яна ўжо пачала рабіць заявы. Вось яшчэ адзін цэнтр. Я проста не хачу пералічваць — яны ад Амерыкі да Варшавы», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, ён упэўнены: калі краіна ўздыбіцца і абрынецца — не будзе работы і спагоняць з яго: «І пляваць я хацеў на ўсе гэтыя пасады, але я сяджу і думаю: а што будзе з вамі, калі яны прыйдуць і пачнуць усё гэта дзяліць? Вас забяруць з трыбухамі. І вы мяне будзеце праклінаць заўсёды: «Мы цябе выбралі, чаму ты не абараніў нас?» Вось што мяне больш за ўсё турбуе».

«Свята месца пуста не бывае», — так Прэзідэнт пракаментаваў прыезд у Белтэлерадыёкампанію журналістаў з Расіі. Пытанне з прыцягненнем расійскіх супрацоўнікаў паўстала пасля таго, як некаторыя з тэлекампаніі пачалі мітынгаваць.

Прэзідэнт падкрэсліў, што прасіў не ціснуць на людзей у працоўных калектывах. «Хтосьці захацеў — ідзіце, нікога не трэба трымаць. Што толку, што ты яго сёння ўтрымаў, угнарыў, а ён усё роўна будзе кукіш у кішэні насіць. Хочаш сыходзіць — сыходзь. Я рабочым у адкрытую пра гэта сказаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама выказаўся пра сітуацыю вакол Купалаўскага тэатра. «Цяпер яны спрабуюць напісаць нейкія заявы. А я думаю: яны хацелі свабоды, у іх лозунг быў — «Свабода. Рынак». Я ім зараз дам (і даў ужо) поўную свабоду. Ёсць калектыў, заяўляйце ў Амерыку, што прывезяце туды спектакль, едзьце туды і стаўце спектакль. Вам заплацяць долар — падзяліце, заплацяць тысячу долараў — тысячу падзяліце. Не прымуць вас — ну, гэта ж рынак», — выказаўся кіраўнік дзяржавы.

Парламенцкі дзённік

«Неабходна аб'ектыўна і без эмоцый разабрацца ў тым, што адбываецца сёння ў Беларусі»

З такім зваротам да кіраўнікоў парламентаў дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза звярнуліся старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.

У пасланні адзначана, што 9 жніўня ў Беларусі адбыліся прэзідэнцкія выбары. Па іх выніках Прэзідэнтам Беларусі абраны Аляксандр Лукашэнка. Выбары прайшлі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і законамі Беларусі. Абсалютная большасць грамадзян падтрымала дзеючы курс на будаўніцтва моцнай незалежнай дзяржавы, ключавым прыярытэтам якога з'яўляецца чалавек, яго дабрабыт і бяспека.

Спікеры палат беларускага парламента падкрэслілі непрымальнасць таго, як хутка шэраг еўраатлантычных чыноўнікаў зрабілі палітычныя заявы і высновы, асобныя з якіх мяжуюць з умяшаннем ва ўнутраныя справы Беларусі, што недапушчальна і супярэчыць агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права.

Старшыні палат парламента Беларусі заклікаюць калег з Еўрасаюза садзейнічаць фарміраванню аб'ектыўнай, прафесійна вывераной і адказнай пазіцыі наконт сітуацыі ў Беларусі.

«Выступаем супраць любых спроб дэстабілізацыі»

Савет Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі выступіў з заявай па выніках правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 9 жніўня 2020 года. Яе тэкст размешчаны на афіцыйных сайтах парламентаў дзвюх краін.

«Выбары былі праведзены ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Беларусі. Яны былі адкрытыя, канкурэнтныя і забяспечылі свабоднае волевыяўленне грамадзян Беларусі», — сказана ў дакументе.

Саюзныя парламентарыі адзначылі, што за ходам выбарчай кампаніі назірала значная колькасць міжнародных назіральнікаў, у тым ліку ад Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі і Міжпарламенцкай Асамблеі СНД. Пры гэтым фактаў, якія ставілі пад сумненне легітымнасць выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, не выяўлена.

Аўтары звароту заклікалі ўсе краіны паважаць суверэнны выбар беларускага народа.

«Лічым, што штучнае нагнятанне сітуацыі вакол вынікаў галасавання супярэчыць літары і духу міжнароднага права. Заяўляем аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржавы і выступаем супраць любых спроб дэстабілізацыі грамадска-палітычнай абстаноўкі ў Рэспубліцы Беларусь, — сказана далей у заяве. — Усе пытанні павінны вырашацца канструктыўна, у рамках дзеючага прававога поля. Упэўненыя, што беларускі народ у гэты адказны момант праявіць мудрасць, захавае мір і стабільнасць у імя працвітання сваёй Радзімы».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Міжнародны вектар

«Рэспубліка Беларусь — ужо рэальнасць»

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ звярнуўся да сваіх калег з краін Еўрапейскага саюза ў сувязі з іх шматлікімі заявамі ў дачыненні да нашай краіны.

«Вы выдатна ведаеце мяне, ведаеце Беларусь і беларусаў. Зараз не XVIII стагоддзе, не 2010 і нават не 2015 год. Рэспубліка Беларусь — ужо рэальнасць. Рэальнасць для Еўропы, рэальнасць для Еўрасаюза, рэальнасць для кожнай з вашых краін. Заклікаю жыць, кантактаваць і ўзаемадзейнічаць з гэтай рэальнасцю», — перадае змест звароту прэс-служба МЗС.

Уладзімір Макей адзначае, што падыходы з еўрапейскімі партнёрамі супадаюць далёка не заўсёды і не ва ўсім і пры першых сур'ёзных выпрабаваннях для Беларусі яны адразу заклікаюць да санкцый. «Гэтым па сутнасці вы пацвярджаеце рацыю тых, хто не верыць у нашу суверэнную здольнасць выбудаваць раўнапраўныя і выгадныя ўсім бакам адносіны з вашымі дзяржавамі. Гэта не першыя санкцыі ў нашай гісторыі. І наша гісторыя на гэтым не скончыцца. Мы іх пройдзем гэтак жа, як і папярэднія. Вынік іх дзеяння вам вядомы. Усе разам мы дакладна страцім час. Страцім рытм, які патрэбны нашым краінам і грамадствам, тым больш у сучасным хуткім свеце», — заявіў кіраўнік МЗС.

Уладзімір Макей канстатаваў, што ў нас цяпер складаная сітуацыя, і задаў рытарычнае пытанне: але якая з вашых краін не праходзіла балючыя этапы нацыянальнага стварэння? «Дайце і нам яго прайсці. Лепш з вашай дапамогай, але без спроб прымусу з выкарыстаннем палітычных, фінансавых і іншых відавочных рычагоў. Прашу дараваць, але мы не зможам гэта разглядаць інакш, як нядобразычлівыя дзеянні, якія наносяць шкоду суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, і не зможам гэта пакідаць без процідзеяння», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Учора таксама адбылася тэлефонная размова міністра замежных спраў Беларусі з расійскім калегам Сяргеем Лаўровым. Як перадае прэс-служба беларускага МЗС, кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў падрабязна абмяняліся думкамі наконт развіцця поствыбарчай сітуацыі ўнутры Беларусі, а таксама рэакцыі заходніх партнёраў і ўзаемадзеяння ў рамках АБСЕ.

Абмеркавалі міністры і пытанні аднаўлення бесперашкоднага перасячэння сумеснай граніцы, закрытай у сувязі з пандэміяй. Сяргей Лаўроў рашуча асудзіў спробы вонкавага ўмяшання ва ўнутраныя справы беларускай дзяржавы і выказаў цвёрдую падтрымку ўмацаванню суверэнітэту і незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Экспертыза пытання

АБ'ЯДНОЎВАЦЬ І ЎЗВЫШАЦЬ ГРАМАДСТВА

Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ — пра сімвалы, якія выкарыстоўваюцца на беларускіх мітынгах апошніх дзён:

— Неабходна адзначыць, што сучасная дзяржаўная сімволіка нашай краіны выразна перадае гісторыка-культурную спадчыну беларускага народа, падкрэслівае яго нацыянальны і грамадзянскі дух, дае ўяўленне аб айчынных духоўных каштоўнасцях.

Чырвоны, зялёны і белы колеры беларускага сцяга абумоўлены як гістарычна, так і светапоглядна, звязаныя з духоўнымі вытокамі нашага народа.

Чырвоны колер здаўна сімвалізуе сонца — галоўную жыватворную крыніцу энергіі. Разам з тым ён увасабляе волю, мужнасць, высакароднасць. Менавіта пад чырвонымі сцягамі Чырвоная Армія і беларускія партызаны вызвалялі нашу зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Зялёны колер — гэта не толькі сімвал Прыроды, але і сімвал маладосці, энергіі любові, вясны і адраджэння, колер шчодрасці, дабрыні і стваральнай працы.

Белы колер сімвалізуе духоўную чысціню, святасць, мудрасць, згоду, свабоду і веды. Ён адпавядае назве нашай краіны «Белая Русь».

Найважнейшая асаблівасць Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь — выкарыстанне нацыянальнага арнаменту як элемента дзяржаўнай сімволікі. Гэта надзвычай рэдкая з'ява на сцягах дзяржаў свету.

Арнамент са старажытных часоў быў характэрным знакам, адметнай рысай усіх культурных народаў.

У аснову арнаменту на Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь пакладзены ўзор «Узыходзячае сонца», вытканы на ручніку ў 1917 годзе сялянкай вёскі Касцелішча на Сенненшчыне Матронай Маркевіч. У ім выкарыстаны старажытныя сімвалы земляробства — ромбы, графічныя варыяцыі якіх вядомыя археолагам па знаходках на тэрыторыі Беларусі. Цэнтральнае месца займае выцягнуты па вертыкалі ромб, ад якога зверху і знізу адыходзяць загнутыя лініі. На працягу тысячагоддзяў ён увасабляе жыватворную энергію сонца і матчынны, жаночы пачатак Зямлі, звязаныя з імі ўрадлівасць глебы і стваральную сілу працы.

У цэнтры галоўнага ромба — дзве перакрыжаваныя лініі з чатырма кропкамі паміж імі. Гэта — старажытны сімвал засеянага поля. Яго таксама трактуюць як «ключ да шчасця», магічнае пажаданне спрыяльнага развіцця падзей. Да таго ж ромб з крыжам — яшчэ адзін старажытны сімвал узыходзячага сонца.

Злучаныя парамі ромбы зверху і знізу арнаменту сімвалізуюць ідэю падаўжэння жыцця. Увесь узор пранізвае ідэя дабра, надзеі на лепшае, пажадання дабрабыту, урадлівасці і росквіту.

Размяшчэнне чырвонага арнаменту на белым фоне адпавядае традыцыям беларускага арнаментальнага мастацтва, у якім, як правіла, на белую аснову нанесены каляровы (часцей за ўсё чырвоны) узор.

Тры паласы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь — гарызантальныя чырвоная і зялёная, вертыкальная белая з чырвоным арнаментам — нясуць пажаданне дабра, поспеху і росквіту нашай краіне, усім яе грамадзянам.

Звернемся да гісторыі бел-чырвона-белага сцяга. Першае. Калі і кім быў створаны бел-чырвона-белы сцяг? Па ўласным сведчанні дзеяча беларускага нацыянальнага руху Клаўдзія Сцяпанавіча Душэўскага (Дуж-Душэўскага), аўтарам эскіза бел-чырвона-белага сцяга быў менавіта ён. У прыватнасці, у аўтабіяграфіі ён пісаў наступнае: «Цікава адзначыць, што беларусы лічылі сваім дзяржаўным сцягам той, што і літоўцы, г. зн. Белую Пагоню на чырвоным полі, але нацыянальнага сцяга не было. Мне давялося зрабіць некалькі праектаў нацыянальнага сцяга, і адзін з іх быў прыняты, менавіта: бел-чырвона-белы». Увесну 1917 года ў Петраградзе над будынкам Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны лунаў такі сцяг.

Другое. Калі і кім выкарыстоўваўся бел-чырвона-белы сцяг? Бел-чырвона-белы сцяг — афіцыйны сцяг Беларускай Народнай Рэспублікі. У 1919—1920 гадах розныя варыяцыі бел-чырвона-белага сцяга выкарыстоўваліся беларускімі вайсковымі фарміраваннямі ў Літве і Польшчы. У 1920 годзе бел-чырвона-белым сцягам карысталіся кіраўніцтва Слуцкага паўстання і ваенныя фарміраванні С. Булак-Балаховіча.

Бел-чырвона-белы сцяг выкарыстоўваўся беларускім рухам у Заходняй Беларусі: Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй, Таварыствам беларускай школы, Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры і іншымі.

Пэўная частка беларускай інтэлігенцыі, якая жыла ў эміграцыі і знаходзілася ў апазіцыі да Савецкай улады, пасля прыходу нацыстаў распачала спробу ўстанаўлення супрацоўніцтва з мэтай стварэння беларускай дзяржавы пад пратэктаратам Германіі. З першых дзён акупацыі тэрыторыі Беларусі яны паспрабавалі на практыцы ажыццявіць задуманае, прыступіўшы да стварэння беларускай дапаможнай адміністрацыі.

Крах плана «Барбароса», параза ў Маскоўскай бітве, ваенныя падзеі вясны — лета 1942 года запатрабавалі новых людскіх рэсурсаў для барацьбы з Чырвонай Арміяй. Беларускія калабаранты скарысталіся гэтай сітуацыяй з мэтай дамагчыся ад германскай акупацыйнай адміністрацыі стварэння Беларускай самаабароны ў якасці асновы будучай беларускай арміі. Дазволіўшы стварэнне Беларускай самаабароны, гаўляйтэр Вільгельм Кубэ даў дазвол 27 ліпеня 1942 года на выкарыстанне на тэрыторыі Генеральнага камісарыята «Беларусь» бел-чырвона-белага сцяга і герба «Пагоня».

Пазней, 21 снежня 1943 года, у Мінску, размешчаным на акупаванай у той момант тэрыторыі, была ўтворана калабарацыянісцкая Беларуская цэнтральная рада (БЦР) з аналагічнай сімволікай.

Бел-чырвона-белы сцяг выкарыстоўваў створаны нацысцкімі акупантамі «Саюз беларускай моладзі».

27 чэрвеня 1944 года ў Мінску з ініцыятывы БЦР адбыўся Другі Усебеларускі кангрэс — з'езд прадстаўнікоў беларускіх калабарацыйных арганізацый і іншых асоб, лаяльных у адносінах да германскіх акупацыйных улад. З сімволікай бел-чырвона-белага сцяга быў праведзены парад калабарацыйнага фарміравання Беларускай краёвай абароны.

Пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР і перайменавання яе ў Рэспубліку Беларусь 19 верасня 1991 года Вярхоўны Савет прыняў Закон «Аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь», які зацвердзіў у якасці дзяржаўнага сімвала бел-чырвона-белы сцяг. Аднак ён быў негатыўна ўспрыняты значнай часткай беларускага грамадства, у тым ліку ветэранскімі арганізацыямі, з-за яго выкарыстання беларускімі калабарантамі падчас акупацыі БССР войскамі нацысцкай Германіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Па выніках рэферэндуму, які адбыўся 14 мая 1995 года, дзяржаўны сцяг быў заменены.

Безумоўна, бел-чырвона-белы сцяг з'яўляецца часткай беларускай гісторыі. Але мы павінны памятаць усе факты, звязаныя з яго выкарыстаннем. Можна па-рознаму ставіцца да гэтага знака, але для мяне бясспрэчна, што нацыянальна-дзяржаўныя сімвалы павінны аб'ядноўваць, а не раз'ядноўваць грамадства.

Больш за тое, давайце задумаемся: незалежна ад нашага стаўлення да бел-чырвона-белага сцяга, якія вынікі выкарыстання гэтага сімвала ў нашай гісторыі? А яны адмоўныя: БНР рэальнай дзяржавай не стала, Слуцкае паўстанне і ваенныя фарміраванні С. Булак-Балаховіча былі разгромленыя, беларускія нацыянальныя арганізацыі ў Заходняй Беларусі былі ліквідаваныя польскімі ўладамі, беларуская калабарацыя пацярпела крах, першая палова 1990-х гадоў у гісторыі суверэннай Рэспублікі Беларусь была часам найцяжэйшага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага крызісу. Значыць, відавочна нешта не так з гэтым сімвалам. І я вельмі сумняваюся, што Рэспубліка Беларусь можа прыйсці да росквіту пад бел-чырвона-белым сцягам.

Разам з тым менавіта пад чырвона-зялёным сцягам з найстаражытнейшым беларускім арнаментам мы дасягнулі выдатных сацыяльна-эканамічных, навуковых і культурных вынікаў у БССР і сучаснай Рэспубліцы Беларусь. Задумайцеся, паважаныя суграмадзяне!

З нагоды

За мір і спакой, супраць расколу

Учора ў музеі Мінскага метрапалітэна стартавала акцыя Беларускага саюза жанчын «Жанчыны за адзінства і мір». Па словах намесніка старшыні грамадскага аб'яднання, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Ліліі АНАНІЧ, Беларускі саюз жанчын апошнім часам актыўна ўдзельнічае ў акцыях, мітынгах за спакойную, стабільную Беларусь.

Арганізатарам учарашняга мерапрыемства стала мінская гарадская арганізацыя грамадскага аб'яднання. Жанчыны Беларусі такім чынам выступаюць за мір, спакой і супраць расколу грамадства.

«Мы кажам, што нам не падабаецца сітуацыя, калі мы не можам спакойна збіраць дзяцей у школы, не адчуваем сябе абароненымі. Таму мы заклікаем усіх да спакою, міру. Трэба рыхтаваць дзяцей да школы, мірна працаваць, стварацъ нашу Беларусь і адстойваць нашы каштоўнасці», — сказала Лілія Ананіч і дадала, што акцыі такога кшталту грамадскае аб'яднанне будзе працягваць.

Таксама Лілія Ананіч выказала сваё меркаванне наконт грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне: «Вось падумалася, як гэта — быць не ў ладах са сваім сумленнем, мяняць перакананні як пальчаткі? І пры гэтым паказваць, быццам раптоўна «стаў відушчым» і аднёсся з пагардай? Падзеі жніўня і лёсавызначальны выбар агалілі многіх асоб. І добра б хлопцаў і дзяўчат, якія абдумваюць жыццё (заблыталіся ў сетках? Падаліся парыву натоўпу або лжывым аўтарытэтам? Ці «не адрознілі» бутэльку з запальнай сумессю ад бутэлькі кока-колы? Цяжкае дзяцінства?..) На жаль, у адносінах да некаторых людзей, у тым ліку і маіх сеткавых падпісчыкаў, гэта пытанні. Мне лягчэй. Перакананняў не мяняла і не змяняю. І сцяг краіны, чырвона-зялёны, мой сцяг. І нацыянальны лідар для мяне наш Прэзідэнт, Аляксандр Лукашэнка. Трымаем удар! Мацуем шэрагі! Перамаглі і перамогу не аддадзім! Як спадкаемцы Вялікай Перамогі! Як прадстаўнікі суверэннай незалежнай Беларусі! За Беларусь!»

Парламентарый задае пытанне: ці не перадвыбарчыя мітынгі сталі сігналамі да масавых пратэстаў і парушэнняў?

«Я жахалася рыторыкі «не баяцца аўтазакаў», параўнання Беларусі са старым драндулетам. Ніхто з альтэрнатыўшчыкаў і не спрабаваў хоць словам добрым аб'ектыўна адгукнуцца пра краіну і пра Прэзідэнта. Але курс сацыяльнай дзяржавы выбіраў сам народ, і мы ўсе яго творцы!» — адзначыла Лілія Ананіч.

Яна адназначна асуджае абразы, прыніжэнні ўсіх, хто мае іншы пункт гледжання, і гвалт.

«Гвалт не прымаю. Я таксама маці і жывы чалавек. Мне таксама душа баліць за тое, што здарылася. І ў першую чаргу за тых маладых хлопцаў, хто прысягаў радзіме і хто быў па службе на лініі супрацьстаяння. І супраць каго накіроўваліся запальныя сумесі і тараны. Нам усім трэба знайсці адказ на многія пытанні, у тым ліку і на самае галоўнае, чаму бацькі не зберагліся сваіх дзяцей і сёння ў захапленні асабістым удзелам у «барацьбе» з уладай цягнуць на пратэсныя вуліцы малалетніх? Дзе гарантыя, што натоўп утрымаецца ў мірным рэчышчы? Каго зноў будзем вінаваціць?» — падкрэслівае парламентарый.

Лілія Ананіч звяртае ўвагу і на тое, што гаворка ідзе пра змену курсу. «І нават без агучвання па складзе ўдзельнікаў з ліку завадатараў, а таксама тых, хто да іх прымазаўся, гэта ясна як божы дзень. Менавіта праз развал эканомікі і імкнуцца асядлаць хвалю пратэсных настрояў. Заклікі на дапамогу «сяброў» усіх масцей і не хаваюць ужо», — выказвае думку намеснік старшыні Пастаяннай камісіі.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў звярнула ўвагу і на сімвал пратэстаў — бела-чырвона-белы сцяг: «Пад гэтым сцягам палілі і катавалі нашу Беларусь фашысты і іх паслугачы. З нарукаўнікамі бела-чырвонага колеру былі прыслужнікі нацыстаў, якія палілі родную хату і жывымі маю бабулю з прабабуляй у вёсцы Дуная на Лагойшчыне. Гэта мой погляд і маё асабістае перакананне».

Лілія Ананіч рэзюмуе: «Вельмі хачу, каб вярнулася галоўнае — спакой і ўзаемапавага адно да аднаго. Каб мы сталі мацнейшыя і каб квітнела наша краіна».

На слыху

А сігнал мусіць быць дарэчы

Раз-пораз вуліцы гарадоў Беларусі агалошваюцца масавымі гукавымі сігналамі кіроўцаў. Але наколькі гэта правамерна? Сітуацыю пракаментавалі ў Галоўным ўпраўленні Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі.

— Так, апошнім часам паступае шмат скаргаў ад грамадзян на шматлікія гукавыя сігналы ад аўтамабіляў. ДАІ прымае меры па навядзенні парадку. У кожным выпадку інспектарамі выкарыстоўваецца індывідуальны падыход. Калі гукавы сігнал быў пададзены з парушэннем, то адказнасць надыходзіць па артыкуле 18.14 КаАП. Пункт 2 гэтага артыкула цягне папярэджанне або штраф у памеры да трох базавых велічынь. Але калі праз ціск на клаксан была створана аварыйная абстаноўка, то санкцыя ўзмацняецца — за гэта прадугледжаны штраф памерам ад 5 да 20 базавых велічынь. Пры гэтым кіроўца можа быць пазбаўлены права кіравання транспартным сродкам на тэрмін да двух гадоў.

Як удакладнілі ў ДАІ, аварыйная абстаноўка ўзнікае ў тым выпадку, калі іншыя ўдзельнікі дарожнага руху — як кіроўцы, так і пешаходы — палохаюцца і праз гэта рэзка змяняюць хуткасць і напрамак руху, ад чаго рэзка ўзрастае рызыка дарожнага-транспартнага здарэння.

Аляксандр КАВАЛЁЎ.

Спажывец

УСЁ ДЛЯ ВУЧОБЫ

У суботу, 22 жніўня, жыхароў Віцебска і гасцей горада запрашаюць на першы маштабны школьны кірмаш.

Вулічны гандаль арганізуюць у самым цэнтры горада: на вуліцы Леніна — гэта ўжо традыцыйнае месца для такіх мерапрыемстваў. З дзевяці раніцы да трох гадзін дня можна будзе набыць усё для школы ў адным месцы...

Наогул пашыраны продаж тавараў для школьнікаў вядзецца з 1 жніўня. Гандлююць больш за восемдзесят крам.

Між іншым, пакупкі да школы можна зрабіць і пазней. Згодна з распараджэннем старшыні гарвыканкама, да 1 кастрычніка ў гандлёвай сетцы горада будзе арганізаваны пашыраны продаж тавараў школьнага асартыменту. Запланаваныя правядзенне выставак-продажаў, акцый са зніжэннем цаны, праграмы крэдытавання і растэрміноўкі аплаты.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Будзь у курсе!

МЕТРО ПЕРАХОДЗІЦЬ НА ЗІМОВЫ РЭЖЫМ РАБОТЫ

Адбудзецца гэта з 24 жніўня, паведамляе Telegram-канал сталічнага метрапалітэна.

Інтэрвал руху цягнікоў па буднях у ранішнія гадзіны пік з 7.00 да 9.00 і ў вячэрнія гадзіны пік з 17.00 да 19.00 складзе 2 хвіліны на першай і другой лініях.

Па пятніцах вячэрнія гадзіны пік на абедзвюх лініях пачынаюцца з 16.00 і заканчваюцца ў 18.30.

Станцыі адкрытыя для прыёму пасажыраў з 5.30 да 0.40. На станцыі «Купалаўская» ўваход з боку вуліцы Карла Маркса адкрыты з 7.00 да 21.00.

Першыя цягнікі з канчатковых станцый адпраўляюцца па рабочых днях у 5.32 са станцый «Малінаўка», «Уручча», у 5.33 — са станцый «Магілёўская», «Каменная Горка»; па суботах — у 5.32 са станцый «Уручча», «Малінаўка», «Каменная Горка», у 5.33 — са станцыі «Магілёўская»; па нядзелях — у 5.32 са станцый «Уручча», «Малінаўка», у 5.33 — са станцый «Магілёўская», «Каменная Горка».

Апошнія цягнікі з канчатковых станцый адпраўляюцца ў 0.42 са станцый «Малінаўка», «Уручча», «Каменная Горка», у 0.43 — са станцыі «Магілёўская».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Спорт

І з каранавірусам можна спаборнічаць

Як спорт прывыкае да новых рэалій

Спартыўная грамадскасць сёлета ўмоўна падзялілася на дзве часткі. Адны міжнародныя федэрацыі адмяняюць буйныя спаборніцтвы, не жадаючы рызыкаваць здароўем удзельнікаў, іншыя падстройваюцца пад эпідэміялагічную сітуацыю.

Міжнародная федэрацыя лыжнага спорту ўвяла сістэму тэсціравання на каранавірус, паведамляецца на афіцыйным сайце арганізацыі. Каб быць дапушчанымі да спаборніцтваў, усе ўдзельнікі і арганізатары кожныя 3—4 дні будуць здаваць тэст на антыцелы да COVID-19. Для спартсменаў гэта стане дадатковым аналізам да абавязковага тэсціравання на допінг. Такія меры будуць ужывацца да сакавіка 2021 года.

Тэсціраванне на каранавірус стане абавязковай умовай і для ўдзельнікаў міжнароднай серыі спаборніцтваў па дзюдо World Judo Tour, якая пачнецца ў верасні. Такое рашэнне прыняла міжнародная федэрацыя дзюдо. Спартсмены будуць абавязаныя прадставіць два адмоўныя тэсты на COVID-19 і прад'явіць дакументы, якія пацвярджаюць, што мінімум 14 дзён у іх не было ніякіх сімптомаў каранавіруса. Тэсты павінны быць зроблены з інтэрвалам 48 гадзін максімум за пяць дзён да прыбыцця на спаборніцтвы. Акрамя таго, дзюдаістаў і функцыянеры чакаюць пастаянныя вымярэнні тэмпературы, якія будуць праводзіцца ў пунктах уезду ў краіну, у месцах пражывання спартсменаў і на спартыўных аб'ектах. Абавязковая для ўсіх умова — сацыяльнае дыстанцыраванне і нашэнне масак. Выключэнне — спартсмены падчас барацьбы. Кіраўніцтва міжнароднай федэрацыі адзначыла, што ўдзельнікі спаборніцтваў, якія не выконваюць гэтых умоў, не будуць дапушчаныя да мерапрыемстваў.

Турніры серыі Tennis Europe Junior Tour, якія праводзяцца сярод спартсменаў 14—16 гадоў, вернуцца 31 жніўня з новымі строгімі правіламі бяспекі. Скарачаюцца сеткі ўдзельнікаў. Цяпер нельга ў адзін дзень праводзіць матчы кваліфікацыі і асноўнай сеткі турніру. Матчы будуць праходзіць без гледачоў і з выкананнем строгіх санітарных правіл. Рэалізацыі гэтых мер будзе спрыяць укараненню анлайн-сэрвісу рэгістрацыі на турнір для тэнісістаў. Гэта зменшыць неабходнасць прысутнасці людзей на месцы правядзення спаборніцтваў і збярэжа час спартсменаў і трэнераў.

Правядзенне міжнародных спаборніцтваў, няхай і з новымі правіламі, стане сапраўдным святам для спартсменаў і ўсіх аматараў спорту. Надта ўсе засумавалі па спорце ў гэтым годзе.

Валерыя СЦЯЦКО.

КІРМАШ ВАКАНСІЙ У РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэтым разам кадры для сябе шукалі восем магілёўскіх арганізацый, сярод якіх абласная дзіцячая бальніца, домабудаўнічы камбінат, прадпрыемства «Метыз» Беларускага грамадскага аб'яднання таварыства глухіх, вытворчы інстытут «Магілёўагрампраект», ААТ «Задняпроўе», ААТ «Ольса», ААТ «Зеніт», таварыства «Тыфлас» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. Прапаноўваліся вакансіі інжынераў, электрамеханікаў, прыбіральшчыц, адміністратараў баз даных, бухгалтараў, кіроўцаў, кухараў, правізараў — усяго 147 рабочых месцаў. Заробкі — ад 375 да 1000 рублёў.

За дзве гадзіны сайт наведала 258 чалавек, з іх больш за 40 % людзей ва ўзросце 25-34 гадоў і 25 % тых, каму 35-44.

— Мы пашыраем магчымасці грамадзян, прапануем ім новыя спосабы знайсці работу, — кажа суразмоўніца. — У нас дзейнічае банк вакансій, ён пастаянна папаўняецца, але гэта аднабаковая сувязь. Больш інфармацыі можна атрымаць падчас традыцыйнага кірмашу вакансій, дзе можна задаць пытанне наймальніку і адправіць рэзюмэ. Сёння ў нас існуюць розныя формы ўзаемадзеяння з суіскальнікамі. Гэта і асабісты прыём непасрэдна ва ўпраўленні, і дні прадпрыемстваў, і электронныя кірмашы вакансій. Плюс апошняй формы яшчэ і ў тым, што ў кірмашы могуць удзельнічаць прадпрыемствы не толькі канкрэтнага горада або раёна. Апошнім разам людзей набірала сталічнае прадпрыемства, якое гатова было даць інтэрнат. Калі чалавек згодны на пераезд, чаму б і не скарыстацца такой прапановай? Што датычыцца найбольш папулярнай формы стасункаў, то гэта, канешне, афлайн-сустрэчы. Большая колькасць грамадзян выказвае жаданне прыходзіць і абмяркоўваць усе пытанні з наймальнікам у жывой гутарцы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Эксперымент

Кавун ад «Світанка»

Адно з паспяховых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў вобласці ўпершыню прапанавала спажыўцам сакавітую паўднёвую ягаду сваёй вытворчасці.

Фота БелТА.

Яраслаў ІВАНІЦКІ.

ААТ «Світанак» імя К. Арлоўскага — вядомае ў краіне прадпрыемства, якое спецыялізуецца на вырошчванні агуркоў, памідораў і цэлага шэрагу караняплодаў, сёлета пайшло на эксперымент. Апроч ужо традыцыйных культур, паспрабавала вырасціць яшчэ і кавуны. Першы ўраджай паступіў у тутэйшую гандлёвую сетку ўжо на мінулым тыдні. Учора сабралі яшчэ паўтары тоны салодкай ягады.

— Культура пакуль што для нас новая, мы толькі прыглядаемся да яе, — расказаў **першы намеснік дырэктара гаспадаркі Аляксандр ЖЫЛІНСКІ.** — Пацяпленне, якое мы назіраем апошнія некалькі гадоў, крыху змяніла наш клімат. Вось мы і вырашылі паспрабаваць вырасціць нешта новае, пакуль для нас не вельмі звыклае. Купілі насенне ў Мінску, высадзілі ў цяпліцах, а ў канцы мая пасадзілі ў адкрыты грунт. Частку рассады прадалі калгасу «Дабраволец» Кіраўскага раёна.

Бахча спее на плошчы пяці гектараў. Пакуль павялічваць тэрыторыю пад яе «Світанак» не збіраецца. Хоць паўднёвая ягада наглядна прадэманстравала, што ёй падабаецца пад беларускім сонейкам. Некаторыя экзэмпляры выраслі аж да 10 кілаграмаў. У гаспадарцы спадзяюцца сабраць сёлета 100—120 тон. А налета пасадзіць яшчэ.

Дарэчы, «Світанак» спецыялізуецца таксама на вырошчванні яблыкаў, а сёлета высадзіў яшчэ і дрэўцы вішні. Так што налета тут прапануюць яшчэ і гэтую ягаду.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Турцыя адкрыла буйное радовішча прыроднага газу ў Чорным моры

Турцыя адкрыла найбуйнейшае ў сваёй гісторыі радовішча прыроднага газу ў Чорным моры. Пра гэта заявіў прэзідэнт краіны Рэджэп Таіп Эрдаган, паведамляе агенцтва «Анадолу».

Па словах прэзідэнта Турцыі, спецыялісты выявілі радовішча прыроднага газу аб'ёмам 320 мільярдаў кубаметраў на свідравіне «Туна-1». Выяўленне радовішча кажа пра тое, што з высокай імавернасцю ў гэтым раёне ёсць і іншыя паклады газу, заявіў турэцкі лідар.

Рэджэп Таіп Эрдаган звярнуў увагу на тое, што энергетыка з'яўляецца не толькі асноўным фактарам развіцця дзяржавы. «Гэтая знаходка вельмі важная з пункту гледжання энергетычнай незалежнасці нашай краіны. Мы былі цалкам залежныя ад паставак энерганосьбітаў з-за мяжы, марнавалі сотні мільёнаў долараў на гэта. Але ў 2017 годзе мы абнавілі нашу энергетычную стратэгію, пашырылі флот даследчых і буравых суднаў», — сказаў ён. «Наша мэта — да 2023 года перадаць чарнаморскі газ у карыстанне народа. Турцыя настроена на вырашэнне праблемы з энергетыкай у краіне на корані», — падкрэсліў Рэджэп Таіп Эрдаган.

Каля берагоў Мальты выратаваны 118 мігрантаў

Узброеныя сілы Мальты выратавалі групу са 118 мігрантаў пасля крушэння судна каля берагоў астраўной дзяржавы. Пра гэта паведамляе «Сіньхуа».

Міністр унутраных спраў Мальты Байран Камілэры расказаў, што мігранты знаходзіліся ў мальтыйскай пошукава-выратавальнай зоне, калі іх судна пацярпела бедства. Ваенна-марскія афіцэры Мальты ўзялі мігрантаў, якія танулі, на борт. Міністр удакладніў, што было выратавана ў тым ліку 10 жанчын і шасцёра дзяцей. Ён дадаў, што выратаваныя мігранты будуць знаходзіцца на карантыне, пакуль усе не атрымаюць вынікі аналізу на COVID-19.

Па словах Камілэры, на працягу першых сямі месяцаў гэтага года ўлады Лівіі перахапілі сем тысяч мігрантаў, якія спрабавалі незаконна адплыць ад узбярэжжа краіны. Мальта плануе ў далейшым цесна супрацоўнічаць з лівійскімі ўладамі, каб пазбегнуць далейшага прыбыцця непажаданых мігрантаў і большай колькасці смерцяў у Міжземным моры, падкрэсліў міністр.

Па звестках Міжнароднай арганізацыі па міграцыі, маршрут па Міжземным моры лічыцца адным з самых небяспечных шляхоў для бежанцаў, якія хочуць дабрацца ў Еўропу.

У Іспаніі ад віруса ліхаманкі Заходняга Ніла памёр першы пацыент

Жыхар іспанскай правінцыі Севілья памёр ад віруса ліхаманкі Заходняга Ніла. Пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на агенцтва EFE.

Паводле яго інфармацыі, 77-гадовы мужчына стаў першай ахвярай віруса, успышка якога зафіксавана ў правінцыі. Памерлы некалькі дзён знаходзіўся ў аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі.

Успышка захворвання ў Андалусіі кранула 35 чалавек, 32 былі шпіталізаваны.

Вірус ліхаманкі Заходняга Ніла — вострае інфекцыйнае захворванне. Часцей за ўсё яго пераносчыкамі з'яўляюцца камары.

Гродненский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 400/D-97171 (назначение – магазин, наименование – магазин), площадью 401,2 кв. м, г. Гродно, ул. Красноармейская, 69-17
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000002000780, площадью 0,0639 га (назначение – обслуживание жилого дома со встроенным магазином), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Красноармейская, 69 (доля в праве 677/2500)
Начальная цена продажи – 360 000 руб. (триста шестьдесят тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 36 000 руб. (тридцать шесть тысяч рублей)
Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Условия оплаты – по договоренности сторон
Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Гродненский городской филиал), 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 8-0152-52-02-88
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70
Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 22 сентября 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 15.07.2020 г.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18
Последний день приема заявлений – 18 сентября 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ГЛХУ «Смолевичский лесхоз», Минская область, г. Смолевичи, ул. Первомайская, 72а**

Предмет аукциона: транспортное средство, бывшее в употреблении.
Месторасположение: Минская обл., г. Смолевичи, ул. Торговая, 41

Лот, №	Инв. номер	Наименование	Начальная цена, с НДС, бел. руб.
1	01521214	КАМАЗ 43105, грузовой специальный сортиментовоз, кузов № 006836, рег. знак АВ 0337-5, 1986 г. в.	**15 000,00**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Порядок ознакомления: в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по предварительному согласованию, тел.: 801776 59051, +375 29 704 77 58 (Ермолик Юрий Николаевич)

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения торгов, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение торгов указаны в условиях проведения торгов, определенных в Положении о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**. Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

Дата и время проведения аукциона: 23.09.2020 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Дата и время окончания приема документов: 22.09.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Контактные телефоны: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

Оперативная информация закрытого акционерного общества «ЮНИМИТ» (УНП 690660279)

полное наименование, местонахождение и почтовый адрес юридических лиц, участвующих в реорганизации	1) закрытое акционерное общество «ЮНИМИТ», 222220, Республика Беларусь, Минская обл., Смолевичский район, Плисский сельсовет, 9/12 в районе поселка Октябрьский 2) открытое акционерное общество «Смолевичи Бройлер», 222220, Республика Беларусь, Минская область, Смолевичский район, п. Октябрьский
способ реорганизации	присоединение ЗАО «ЮНИМИТ» к ОАО «Смолевичи Бройлер»
наименование уполномоченного лица (органа), принявшего решение о реорганизации (ликвидации), и дату принятия такого решения	общее собрание акционеров ЗАО «ЮНИМИТ», 18.08.2020
порядок распределения акций среди участников акционерного общества при реорганизации	будет сообщено дополнительно
полное наименование, местонахождение и учетный номер плательщика депозитария, с которым эмитентом, профучастником заключен депозитарный договор	открытое акционерное общество «Сберегательный «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк», 220089, г. Минск, пр. Дзержинского, 18, УНП 100325912

В **суд Ленинского района г. Могилева** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим МОРОЗА Алексея Владимировича, 09.02.1987 года рождения, уроженца г. Бобруйска Могилевской области, зарегистрированного по адресу: г. Бобруйск, ул. Ульяновская, д. 50а, кв. 50, место пребывания с 12.04.19 г. неизвестно.

Просьба к гражданам и юридическим лицам, обладающим какими-либо сведениями о Морозе А. В., в течение двух месяцев с момента публикации сообщить их суду Ленинского района г. Могилева по тел. 8 0222 25 37 85.

Унучка знайшла месца, дзе расстралялі яе дзеда

ЗНЯВАЖАНАЯ ПАМЯЦЬ

Сёння Марына ўшчыльную займаецца вывучэннем спраў рэпрэсаваных свяшчэннікаў. Яна член камісіі па кананізацыі Магілёўскай епархіі. Яшчэ два гады таму, калі яна пачала займацца пошукамі, у яе была толькі адна справа на ўраджэнца Чэрыкаўшчыны, які быў кананізаваны і далучаны да ліку святых. Пра яго паведаміла свячка, і Марына загарэлася ідэяй даведацца пра пакутніка як мага больш. А заадно пашукаць іншых, таксама забытых. Вывучыла кнігу «Памяць», усю інфармацыю мясцовых краязнаўцаў, спецыяльныя сайты і даведалася пра болей чым 100 такіх рэпрэсаваных па Чэрыкаўскім раёне. Аднойчы ёй прынеслі старую раённую газету са спісам рэпрэсаваных. Даследчыца ўбачыла, што ён яшчэ і з працягам і засела ў бібліятэках і архівах. Ёй зараз нават цяжка сказаць, колькі чалавек на сённяшні дзень выяўлена. Яна проста запісвала новыя прозвішчы і абставіны гібелі ў свой нататнік. Знайшліся і родныя апошняга свяшчэнніка, якога загрызлі сабакі на этапе. І гэтыя людзі перадалі Марыне звесткі з сямейнага архіва. Інфармацыя пра роднага дзеда ўсплыла нечакана. Аднойчы яна падала спіс прозвішчаў для пошуку матэрыялаў па іх у КДБ і ўпісала туды імёны сваіх дзядоў — а раптам пашчасціць. Самае цікавае, што ў архіве знайшлася справа менавіта на Івана Кальчыбу.

— У мяне такое адчуванне, што дзед сам мяне знайшоў, — прызнаецца Марына. — Пра яго, лічы, не было ніякай інфармацыі, я нават не разлічвала знайсці справу дзеда ў архіве. Івана Кальчыбу рэабілітавалі ў 2001 годзе, але тады мне сказалі, што нічога на яго няма. У майго таты доўгі час была крыўда на бацьку, бо ад таго, што ён вораг народа, пакутавала ўся сям'я. Калі мне паведамілі, што справа ёсць, мы пайшлі глядзець яе разам з татам. Калі ён сваімі вачыма ўбачыў тыя дакументы і прачытаў, што бацька не вінаваты, заплакаў. Ён лічыў бацьку здраднікам, а той аказаўся добрым чалавекам. Для мяне гэта самае важнае, што я зрабіла ў сваім жыцці. Я дапамагла чалавеку, якому ўжо 80 гадоў, зняць цяжар з душы.

У 1939 годзе Іван Кальчыба быў ўдзельнікам савецка-фінляндскай вайны, атрымаў раненне ў сківіцы і быў камісаваны. А ў сакавіку 41-га паехаў у Карэлію, туды, дзе ваяваў, на заробкі, каб сям'ю пракарміць. На той момант у яго ўжо быў чатырохгадовы сын і павінна было з'явіцца яшчэ адно дзіця.

— Дзед так і не ўбачыў сваю дачку — яго ўжо расстралялі, — уздыхае Марына. — Дзедавы сёстры расказвалі, што ён марыў, калі гэта будзе дзяўчынка, назваць яе на польскі манер Браніслава, але дзяўчынцы далі імя Зінаіда. Растлумачылі, што імя Браніслава няма.

Калі пачалася вайна, Іван Кальчыба быў прызваны на службу Беламорскім ваенкаматам. Яму даручылі ахоўваць аб'екты. Што менавіта, не ведаю. У справе было напісана, што «з сакрэту вярнуўся». Цалкам я не пачытала справу, яе далі на абмежаваны час. Але я цяпер ведаю, што дзед загінуў ні за што. У той час фашысты рэгулярна скідвалі з самалёта прапагандысцкія ўлёткі з заклікамі пераходзіць на іх бок. І чырвонаармеец Кальчыба меў неасцярожнасць такую ўлётку падабраць на самакрутку. Мяркуючы па пратаколе допыту, тры калегі, нібыта, паказалі, што ён схіляў іх на здраду. Дзед сваю віну не прызнаваў, але на даносчыкаў зла не трымаў. У справе пра гэта таксама гаворыцца.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Затрымалі яго ў лістападзе 41-га. Першы допыт быў у дзве гадзіны ночы. Чытала, што яго білі бярвёнамі, катавалі. У выніку абвінавацілі ў тым, што ён хоча здрадзіць радзіме і 27 снежня вынеслі прысуд — расстрэл. А расстралялі 10 лютага 1942 года. Яму было ўсяго 33 гады. Мне зрабілі копіі арыгіналаў, але некаторыя дакументы наогул не паказалі. А праслаўтую фашысцкую ўлётку аддалі, маўляў, ніякай каштоўнасці яна не ўяўляе.

Захавалася сямейная гісторыя, што, калі сына арыштавалі, бацька прадаў усіх свіней і карову ды паехаў яго выратаваць. Але вярнуўся ні з чым.

ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ КІЛАМЕТРАЎ У ПОШУКАХ ПРАЎДЫ

— Знаёмая пераканала мяне, што трэба ехаць на Салаўкі, шукаць сляды дзеда, — кажа Марына. — І я рызыкнула. Уладыка Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній даў благаслаўленне, і мы са знаёмай паехалі. Было крыху страшна, бо ехалі ў нікуды. Мелі толькі білеты на цягнік туды і назад.

Прыехалі ў нейкую закінутую вёску, глуш вакол, трава па пояс і толькі вузкая сцяжынка ад платформы. Людзі пайшлі па ёй, а за імі і Марына са сваёй знаёмай. Прыйшлі да таксістаў, спыталіся, дзе Салавецкае падвор'е. Аказалася, што трэба было замовіць месцы на катар на Салаўкі. І гэта часцей за ўсё робяць ледзь не за паўгода. Але, як ні дзіўна, месцы знайшліся. Жанчыны прыплылі і разгубіліся, а дзе спыніцца.

— Аказалася, што месцаў для паломнікаў няма, — дзеліцца Марына. — Дзякуй жанчыне, якая паломнікаў засяляла, яна прапанавала нам месцы, прычым бясплатна. Спалі на падлозе, але галоўнае — пад дахам над галавой.

Хутка высветлілася, што ў 39-м салавецкі лагер закрылі, і перасыльны пункт турмы знаходзіўся ў Кемі. Калі жанчыны прыехалі туды, першай справай зайшлі ў храм, які пабудавалі ў гонар новапакутнікаў. Марына разгаварылася з царкоўнай работніцай, сцісла расказала, што яе сюды прывяло. І тая параіла пазнаёміцца з мясцовай журналісткай, якая займаецца пошукам звестак пра расстраляных, нават выстаўку арганізавала. І тэлефон патрэбны знайшла. Марына патэлефанавала, і журналістка прапанавала паглядзець яе выстаўку. Убачанае ўразіла паломніц, а журналістку зацікавілі архіўныя дакументы Марыны.

— Яна сказала, што нават не падазравала, што ў 42-м былі расстрэлы, думала, што яны закончыліся ў 39-м, калі закрылі Салавецкі лагер, — кажа суразмоўніца. — А потым успомніла, што яе настаўнік, які падчас вайны быў маленькім хлопчыкам, бачыў, як вялі натоўп салдат. Ён спытаўся, куды вы ідзяце. І адзін з іх адказаў — на расправу.

ПА СЛЯДАХ ДЗЕДА

З інтэрнэту Марына ведала, што ў 90-я гады ў Кемі знайшлі роў, дзе было шмат чалавечых астанкаў з пластрэленымі чарапамі. Пабываць на гэтым месцы дапамагла яшчэ адна журналістка з раённай газеты Вераніка Фядотава. Пакуль ішлі разам з ёй у музей, Марыне паказалі турму, дзе трымалі яе дзеда. Месца выкупілі, але агароджа тых часоў яшчэ захавалася.

— Я ўвесь час адчувала, што іду па слядах дзеда, — згадвае суразмоўніца. — У музеі падрабязна расказалі пра роў — ён быў за восем кіламетраў ад горада. Знайшлі таксіста, які, калі даведаўся, з якой мэтай едзем туды, узяў за свае паслугі меншую суму ды яшчэ дапамагаў шукаць паклонны крыж, там устаўлялі. Калі знайшлі яго, што сэрца зашчаміла. А калі чытала памінальную малітву, на імгненне трапіла ў нейкую іншую рэальнасць, перастала чуць галасы людзей і шум лесу. Было адчуванне, што я перажыла стан тых пакутнікаў, калі іх расстрэльвалі. Адчула лёгкасць вылятаючай са знясіленага цела душы. Усе знешнія шумы былі фонам па той бок ад мяне.

На наступны дзень раніцай група адправілася на могілкі, дзе перапахавалі забітых.

— Вераніка Фядотава абзваніла ўсіх знаёмых гісторыкаў, але яны не ведалі, дзе магіла, — кажа Марына. — Мне ж здавалася, што як толькі я апынуся на месцы, сама ўсё знайду. Так яно і атрымалася. Проста на ўваходзе на могілкі, я паказала на два крыжы збоку. Журналістка здзівілася, сказаўшы, што колькі разоў тут хадзіла, ніколі не звяртала ўвагі на іх. Я выбрала адзін крыж, нават не разумеючы, чаму менавіта яго. Мне падалося, што ў гэтай магіле мой дзед. Адкрыла інтэрнэт, каб зверыць інфармацыю, тыя крыжы або не. І чытаю, што пры раскопках і перапахаванні прысутнічаў пракурор Кокаў. І тут высветлілася, што Вераніка яго ведае. Яна набірала яго нумар і пракурор адказаў.

Я спыталася, ці трапляў яму на вочы чэрап з пластрэленымі сківіцамі. Майму здзіўленню не было мяжы, калі ён адказаў, што доўга трымаў такі чэрап у руках і не мог зразумець, чаму пластрэленыя і сківіцы, і патыліца. Гэта было неверагодна. Напэўна, я першая, хто знайшоў рэпрэсаванага па астанках.

ПОМНІК АД БЕЛАРУСАЎ

У планах Марыны яшчэ раз з'ездзіць на Салаўкі і высветліць, каго расстрэльвалі разам з яе дзедам. Хоча, каб іх імёны таксама былі ўвекавечаны.

— Калі займалася дакладам пра беларусаў, якія прайшлі праз гэты лагер, паўгода выбірала імёны, што там былі, — кажа яна. — Ва ўрочышчы Сандармох было расстраляна шмат беларусаў. Помнікі там устанавілі ўкраінцы, палякі, азербайджанцы... Мне стала няёмка, што нашага няма. І я вырашыла выправіць прабел. Летась, калі была на Калядных чытаннях у Мінску, размаўляла з уладыкам Барысаўскім і Мар'інагорскім Веньямінам. Ён параіў даведацца, якая там епархія, а таксама прапанаваў паставіць помнік. Вельмі шмат загінула духавенства ў тых мясцінах. І трэба аддаць усім гэтым пакутнікам даніну павагі. Зараз я гэтым і займаюся.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Марыны КАЛЬЧЫБЫ.

Прыёмная кампанія — 2020

ХТО Ў ІНЖЫНЕРЫ-БУДАЎНІКІ?

План прыёму па будаўнічых спецыяльнасцях у ВНУ Беларусі будзе выкананы — пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства архітэктуры.

Размова ідзе пра сем профільных вышэйшых навучальных устаноў, дзе рыхтуюць кадры для будаўнічай галіны: БНТУ, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы і Беларуска-Расійскі ўніверсітэт.

Па папярэдніх звестках, на спецыяльнасці будаўнічага профілю ў 2020 годзе прынятыя 874 чалавекі. Конкурс склаў 1,94 чалавека на месца, а сярэдні прахадны бал вар'іруецца ў межах 220. Больш за ўсё студэнтаў (212) прынята ў БрДТУ. У гэтым жа ўніверсітэце і самы высокі прахадны бал — 262. А самы высокі конкурс быў у Беларуска-Расійскім універсітэце — 3,3 чалавека на месца.

Дарэчы, летась у краіне была распрацавана і зацверджана сектаральная рамка кваліфікацый для будаўнічай галіны. Упершыню распрацаваны пяць прафесійных стандартаў: «Агульнабудаўнічыя работы. Арганізатар будаўнічай вытворчасці», «Узвядзенне каменных і армакаменных канструкцый», «Правядзенне дахавых работ», «Выкананне тынкоўчых і малярных работ», «Работы па абліцоўванні паверхняў пліткай». Да канца 2023 года плануецца распрацаваць яшчэ 16 прафстандартаў.

З улікам сучасных тэндэнцый развіцця будаўнічай галіны пастаянна абнаўляецца змест навучальных праграм, укараняецца практыка цеснага ўзаемадзеяння арганізацый — заказчыкаў кадраў і ўстаноў адукацыі, у тым ліку за кошт пашырэння іх сувязяў у мэтах развіцця кадравага і матэрыяльна-тэхнічнага патэнцыялаў адукацыйнага асяроддзя.

КОНКУРС НА ЮРЫСТА — 7,5 ЧАЛАВЕКА НА МЕСЦА

Вынікі ўступнай кампаніі падведзены ў Юрыдычным каледжы БДУ.

Сёлета ў прыёмную камісію паступіла 507 заяў ад ахвотных навучацца ў Юрыдычным каледжы. Залічана 150 навучэнцаў, з іх на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі на аснове базавай адукацыі залічана 25 чалавек. Конкурс склаў 6,8 чалавека на месца, прахадны бал — 9,6. З 25 залічаных пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай маюць 18 чалавек.

На дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі на аснове сярэдняй адукацыі залічана таксама 25 чалавек. Конкурс сёлета склаў 7,5 чалавека на месца (у 2019 годзе — 4,2). Прахадны бал — 25,9 (у 2019 годзе — 24,0).

На дзённую платную форму атрымання адукацыі на аснове агульнай базавай адукацыі было пададзена 182 заявы. Залічана 75 навучэнцаў. Конкурс — 2,4 чалавека на месца (у 2019 годзе — 1,3). Прахадны бал склаў 9,0 (у 2019 годзе — 8,3).

На дзённую платную форму атрымання адукацыі на аснове сярэдняй адукацыі з 47 ахвотных прынята 25 чалавек. Конкурс склаў 1,9 чалавека на месца (у 2019 годзе — 2,4). Для навучання на платнай форме абітурыентам неабходна было набраць 21,7 бала (у 2019 годзе — 20,9).

Сацыяльны ракурс

Найлепшыя практыкі — для распаўсюджвання

З 1 верасня стартуе «Марафон паспяховых практык».

Ён будзе праходзіць да 30 лістапада і ахопіць навучэнцаў, педагагічных работнікаў устаноў прафесійнай адукацыі, спецыялістаў абласных інстытутаў развіцця адукацыі, вучэбна-метадычных цэнтраў прафесійнай адукацыі.

У ліку галоўных задач, пастаўленых арганізатарамі, — вывучэнне і распаўсюджванне найлепшых практык работы ўстаноў прафесійнай адукацыі па папулярызацыі здаровага ладу жыцця. Рэспубліканскі праект «Марафон паспяховых практык» будзе праводзіцца ў тры этапы па наступных намінацыях: «Антынаркатычны бар'ер», «Моладзь XXI стагоддзя — пакаленне ЗАЖ», «За ўсвядомленае жыццё без наркотыкаў». Пераможцы і прызёры конкурсу па кожнай з намінацый узнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені Міністэрства адукацыі і дыпломамі Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі.

Інфармацыя аб парадку, умовах, выніках марафону будзе размешчана на сайтах Міністэрства адукацыі і Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі.

Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
по продаже имущества республиканской формы собственности и имущества ОАО «Лепельский ремонтно-механический завод»

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № 2020.Г.002.00017 по продаже недвижимого имущества и оборудования на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

Продавец № 1: Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. +375 17 223 93 96.

Продавец № 2: открытое акционерное общество «Лепельский ремонтно-механический завод», тел.: +375 2132 4-15-86.

Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел + 375 (212) 24-63-12, +375 (212) 42-60-11, +375 (29) 884-96-79, +375 (29) 391-09-56, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 23.09.2020 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

ЛОТ № 1, состоящий из следующих объектов:

Капитальные строения и изолированные помещения, расположенные на земельном участке с кадастровым № 241200000001000579 площадью 2,2756 га по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Е (целевое назначение – земельный участок для производственных нужд, право постоянного пользования):

- Капитальное строение с инв. № 230/С-7700 площадью 1603,1 кв. м, наименование – пункт технического обслуживания на 50 автомобилей с зарядной станцией для обслуживания электропогрузчиков на 25 единиц, назначение – здание специализированное иного назначения, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2.

- Изолированное помещение с инв. № 230/D-11143 площадью 6415 кв. м, наименование – цех металлоконструкций, назначение – производственное помещение, примечание: помещение расположено на 1-м, 2-м этаже, антресоль, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Е-1.

- Изолированное помещение с инв. № 230/D-11144 площадью 164,5 кв. м, наименование – подвал цеха металлоконструкций, назначение – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Е-2.

Изолированные помещения с инв. № 230/D-11143 и № 230/D-11144 расположены в капитальном строении с инв. № 230/С-7703 площадью 6579,5 кв. м, наименование – цех металлоконструкций, назначение – здание специализированное для металлургического производства и металлообработки по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Е (совместное домовладение).

- Капитальное строение с инв. № 230/С-17275 площадью 4973 кв. м, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, трое ворот, ограждение, калитка, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, благоустройство территории земельного участка с кадастровым номером 241200000001000579.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-17458 протяженностью 1566,8 м, наименование – ливневая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, ливневая канализационная сеть ОАО «Лепельского ремонтно-механического завода».

- Капитальные строения, расположенные на земельном участке площадью 0,8722 га с кадастровым № 22275010000100461 5 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Ж (целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий по производству тепловой энергии, право постоянного пользования):

- Капитальное строение с инв. № 230/С-7701 площадью 613,7 кв. м, наименование – котельная, назначение – здание специализированное иного назначения, составные части и принадлежности: дымовая труба, пристройка, проезжая часть, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Ж. Элементы благоустройства являются общим благоустройством территории земельного участка с кадастровым № 224750100001004615.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-7704 площадью 93,3 кв. м, наименование – мазутохранилище, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка, проезжая часть, ограждение, калитка, маслоуловитель, нулевая емкость, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Ж/1. Элементы благоустройства являются общим благоустройством территории земельного участка с кадастровым № 224750100001004615.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-12395 площадью 59,1 кв. м, наименование – склад для хранения кислорода, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка, крыльцо, примечание: склад для хранения кислорода одноэтажный, стены кирпичные и металлическая сетка, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2, находящиеся на земельном участке с кадастровым № 224750100001004616 площадью 0,0340 га по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2, целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий общепромышленного назначения (право постоянного пользования).

- Капитальные строения, расположенные на земельном участке площадью 3,6656 га с кадастровым № 224750100001004613 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2 (целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений общепромышленного назначения, право постоянного пользования):

- Капитальное строение с инв. № 230/С-7698 площадью 9942,3 кв. м, наименование – главный производственный корпус, назначение – здание специализированное иного назначения, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-12303 площадью 2498,3 кв. м, наименование – подкрановые пути, назначение – здание неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2. Обременение – договор аренды части капитального строения № 28-05-19 части капитального строения от 28.05.2019 сроком действия по 27.05.2024.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-7533 площадью 1187,3 кв. м, наименование – склад МТС, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: крыльцо; примечание: склад МТС одноэтажный, стены кирпичные, металлическая сетка, крупнопанельные плиты, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-12309 площадью 73,8 кв. м, наименование – очистные сооружения внутриплощадочные, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-12306 объемом 250 куб. м, наименование – противопожарный резервуар 250 куб. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-7537 площадью 126,5 кв. м, наименование – столярное отделение, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, примечание: столярное отделение одноэтажное кирпичное, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-12394 площадью застройки – 617 кв. м, наименование – площадка для хранения ремфонда, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, составные части и принадлежности – ограждение, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2.

- Изолированное помещение с инв. № 230/D-11090 площадью 221,8 кв. м, наименование – изолированное помещение № 2, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2-2. Изолированное помещение расположено в капитальном строении с инв. № 230/С-7699 площадью – 3771,3 кв. м, наименование – административно-бытовой корпус, назначение – здание административно-хозяйственное, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2.

- Изолированное помещение с инв. № 230/D-11088 площадью 3299,6 кв. м, наименование – изолированное помещение № 1, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2-1. Нач. цена: 588 241,98 (пятьсот восемьдесят восемь тысяч двести сорок один рубль 98 копеек) белорусских рублей без учета НДС.

- Изолированные помещения с инв. № 230/D-11090 и № 230/D-11088 расположены в капитальном строении с инв. № 230/С-7699 площадью 3771,3 кв. м, наименование – административно-бытовой корпус, назначение – здание административно-хозяйственное, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 2. Примечания: помещения технического паспорта административно-бытового корпуса площадью 8,3 м² (по плану помещение коридора 1), помещение площадью 125,9 м² (по плану помещение санузла 4), помещение площадью 6,3 м² (по плану помещение коридора 2), помещение площадью 6,3 м² (по плану помещение санузла 5), помещение площадью 98,1 м² (по плану помещение коридора 3) – помещения общего пользования между изолированными помещениями № 1 и № 2.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-17276 площадью 6904,2 кв. м, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть, ограждение, трое ворот, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, благоустройство территории земельного участка с кадастровым № 224750100001004613.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-7536 площадью 128,2 кв. м, наименование – станция обезжелезивания, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: артскважина, примечание: станция обезжелезивания одноэтажная кирпичная, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2В, находящееся на земельном участке с кадастровым № 224750100001005346 площадью 0,1657 га по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2В, целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий общепромышленного назначения. Право постоянного пользования.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-8093 площадью 2080,3 кв. м, наименование – арочник, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Д, расположенное на земельном участке площадью 1,0326 га с кадастровым № 224750100001005693 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Д, целевое назначение – земельный участок для обслуживания арочного сооружения (право постоянного пользования). Обременение – договор аренды части капитального строения № 04-2018 от 02.05.2018, срок действия – по 01.05.2023.

- Капитальное строение с инв. № 230/С-17177 протяженностью 858,9 м, наименование – сети водоснабжения, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, сети водоснабжения ОАО «Лепельского ремонтно-механического завода».

- Капитальное строение с инв. № 230/С-17175 протяженностью 1267,5 м, наименование – хозяйственно-фекальная канализация, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, хозяйственно-фекальная канализация ОАО «Лепельского ремонтно-механического завода».

- Ограждение площадки для трактора, инв. № 0052. Трансформаторная подстанция ТП-10, инв. № 1261. Щит распределительный, инв. № 1279. Щит ЦУЗГ 600-500, инв. № 1274. Щит распределительный, инв. № 1280. Подкрановые пути, инв. № 002257. Наружное освещение 0,4 кВтч, инв. № 1027. Электрокранбалка опорная, инв. № 399 (обременение: договор аренды от 23.09.2019 № 119 сроком по 01.05.2023). Кран-балка, инв. № 376 (обременение: договор аренды от 28.05.2019 № 60 сроком по 27.05.2024). Кран-балка, инв. № 372. Кран-балка 5 т, инв. № 411. Кран-балка 3 т, инв. № 336. Кран-балка, инв. № 337. Кран-балка 1 т, инв. № 379. Кран-балка, инв. № 384. Кран-балка 5 т, инв. № 406. Кран-балка, инв. № 412. Кран-балка, инв. № 413. Кран-балка 1 т, инв. № 414. Кран Козловой 10ТС, инв. № 402. Кран-штабелер, инв. № 381. Кран-штабелер, инв. № 382. Электрокранбалка 1,0, инв. № 385. Кран подвесной 5 т, инв. № 405. Кран подвесной 5 т, инв. № 407. Резервуар для хранения н/продуктов метал. 5,4 куб. м, инв. № 0180. Резервуар для хранения н/продуктов метал. 25 куб. м, инв. № 0181. Емкость металлическая 25 куб. м, инв. № 0193. Емкость металлическая для хранения нефтепродуктов, инв. № 0194. Емкость металлическая для хранения нефтепродуктов, инв. № 0196, находящееся по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2

Начальная цена Лота № 1: 2 414 653,15 (два миллиона четыреста четырнадцать тысяч шестьсот пятьдесят три рубля 15 копеек) белорусского рубля без учета НДС.

Задаток: 241 465,32 (двести сорок одна тысяча четыреста шестьдесят пять рублей 32 копейки) белорусского рубля.

Имущество, входящее в состав лота № 1, находится в собственности ОАО «Лепельский ремонтно-механический завод», за исключением изолированных помещений с инв. № 230/D-11144 и № 230/D-11090, находящихся в республиканской собственности.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном «Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом ЭТП. Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 17.09.2020. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК МТВКBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия торгов**: победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов в соответствии со сметой затрат и оплатить услугу по размещению одного аукциона, затраты на обслуживание ЭТП в зависимости от цены продажи имущества, выставляемого на торги, согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП, возместить затраты по проведению независимой оценки в размере 559,37 (пятьсот пятьдесят девять рублей 37 копеек) белорусского рубля с НДС 20 %; оплатить НДС сверх цены продажи на имущество, находящееся в собственности ОАО «Лепельский ремонтно-механический завод», – имущество лота за исключением изолированных помещений с инв. № 230/D-11144 и № 230/D-11090;

заключить договоры купли-продажи предмета торгов в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов; оплатить предмет торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; по соглашению сторон возможно представление рассрочки оплаты согласно действующему законодательства; передача имущества осуществляется в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by/nedvizhimost/drugaya_nedvizhimost/, в разделе: недвижимое имущество – другое. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом в рабочие дни с 24.08.2020 по 17.09.2020 с 09.00 до 17.00 по месту нахождения имущества по тел.: +375 2132 69445, +375 29 8720308.

Извещение об электронных торгах опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу http://gki.gov.by, на сайте Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by, на сайте электронной торговой площадки https://etpvit.by.

Міхаіл ЗМУШКО:

«САМАЯ ГАЛОЎНАЯ ЎЗНАГАРОДА — БАЧЫЦЬ, ЯК ПАЦЫЕНТУ СТАНОВІЦЦА ЛЕПШ»

Месяцы напружанай працы, «чырвоныя зоны» ў бальнічных калідорах і сіла надзеі на выздараўленне — COVID-19 выпрабаваў на трываласць урачоў, медсясцёр і жыхароў усіх абласцей. Пра тое, як у паўднёва-ўсходнім рэгіёне рыхтаваліся да пандэміі COVID-19, змагаліся за жыццё кожнага пацыента і ці ёсць месца цуду ў бальнічнай палаце, расказаў БелТА намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама Міхаіл Змушко. Яго, як і іншых калег, адзначылі ў міністэрстве за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўнёсак у развіццё і ўдасканаленне сістэмы аховы здароўя.

— Сёлета эпідэміялагічная сітуацыя паднесла ўрачам і медперсаналу няпростае выпрабаванне ў сувязі з COVID-19. Некаторыя параўноўвалі пандэмію інфекцыі з чумой. Ці былі гатовыя нашы медработнікі да такога выкліку?

— Штогод у халодны сезон мы сутыкаемся з уздымам захваральнасці на грып і ВРВІ. У гэты перыяд прыкметна павялічваецца колькасць зваротаў па медыцынскую дапамогу ў паліклінікі і стацыянары вобласці. Думаю, гэта заўважна кожнаму. Таму парадак аказання меддапамогі насельніцтву ў сезон уздыму захваральнасці адпрацаваны за доўгія гады да з'яўлення каранавіруснай інфекцыі.

У работнікаў інфекцыйнай і санітарна-эпідэмічнай службаў таксама ёсць вопыт у лакалізацыі і ліквідацыі іншых інфекцыйных захворванняў. Гэта тыя ж менінгіты, адзёр, кішэчныя інфекцыі. У нашай вобласці, як і ў іншых рэгіёнах, рэгулярна праводзяцца трэніровачныя вучэнні па лакалізацыі і ліквідацыі ачагоў інфекцыйных захворванняў. Таму да падобных выклікаў нашы сістэмы аховы здароўя і санітарнага кантролю былі папярэдне гатовыя.

Вядома, адсочвалі сітуацыю з COVID-19 у свеце. І ў Беларусі ў цэлым, і ў Гомельскай вобласці прымалі рашэнні ў рэжыме рэальнага часу. Так, былі пэўныя моманты, калі даводзілася аператыўна перараз мяркоўваць рэсурсы, часова перапрафіляваць фонд ложкаў. Сёння мы можам казаць, што сістэма аховы здароўя нашай вобласці справілася з першай хваляй каранавіруснай інфекцыі. Гэтага ўдалося дасягнуць дзякуючы падтрымцы выканаўчай улады і высокай кваліфікацыі медработнікаў.

— Якія меры давялося прымаць са з'яўленнем першых хворых у вобласці і ростам іх колькасці?

— Пачалі дзейнічаць яшчэ са з'яўленнем першых хворых у краіне. У Гомельскай вобласці быў распрацаваны і зацверджаны рэгіянальны план па перапрафіляванні ложкавага фонду бальніц з улікам эпідэміялагічнага становішча. Гэта пасля дазволіла нам працаваць на апярэджанне і на піку захваральнасці не прывяло да паралічу работы ўстаноў аховы здароўя, як гэта адбылося ў Італіі. Каб аказаць меддапамогу пацыентам з лёгкай формай захворвання, прыцягвалі ўрачоў іншых спецыяльнасцяў. Але гэта не адбілася на якасці дапамогі, бо ўсе — вопытныя спецыялісты. У перыяд неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыі ў Гомельскай вобласці было задзейнічана каля чатырох тысяч урачоў і 15 тысяч сярэдніх медыцынскіх работнікаў.

— Некаторыя ўрачы і медсёстры прызнаваліся, што ў сітуацыі, якая склалася, адчувалі сябе інтэрнамі, не маючы вопыту дзеянняў ва ўмовах такой жорсткай пандэміі. Як думаеце, медыкі рэгіёна вытрымалі гэты няпросты экзамен?

— Меры бяспекі, якія неабходна выканаць пры рабоце з інфіцыраванымі COVID-19 пацыентамі, не былі беспрэцэдэнтнымі. Ахова здароўя і раней сутыкалася з асабліва небяспечнымі інфекцыямі. Пэўнай праблемай стала адсутнасць поўнай інфармацыі пра характарыстыкі новага віруса. Як вядома, у любых жыццёвых сітуацыях найбольшы страх у людзей выклікае невядомае.

Трэба сказаць, што як толькі з'явіліся першыя паведамленні пра распаўсюджванне каранавіруса з Кітая ў еўрапейскі рэгіён, мы пачалі рыхтавацца да магчымага пападання інфекцыі ў Беларусь. Аператыўна адсочвалі сітуацыю ў іншых краінах, кантактавалі з замежнымі калегамі па ўсіх лячэбных і арганізацыйных пытаннях. На аснове гэтага выпрацоўвалі свой механізм барацьбы з вірусам.

Калі ў Віцебскай вобласці пацвердзілі дыягназ COVID-19 у першага пацыента, у Гомельскай вобласці ўжо прайшла маштабная падрыхтоўка да работы з такімі хворымі. Мы перапрафілявалі бальніцы для аказання дапамогі пацыентам з імавернай і пацверджанай інфекцыяй COVID-19, забяспечылі ўстановы сродкамі індывідуальнай аховы, антысептыкамі і дэзсродкамі. Быў створаны незніжальны запас лекаў, навучаны медыцынскі персанал, падрыхтаваны пункты падключэння да кіслароду, абноўлены парк ШВЛ, выкананы іншыя мерапрыемствы. Таму адказаць на пытанне магу адназначна: мы былі гатовыя і справіліся.

— Што дапамагала выстаяць пры павышанай нагрузцы ў няпростых умовах?

— Бяда аб'ядноўвае людзей. Трэба сказаць, што ўсе словы прызнання і ўдзячнасці, якія гучалі на адрас медыцынскіх работнікаў, вельмі натхнялі. Напружаныя ўмовы работы з гэтай інфекцыяй дазволілі выйсці з руціны і ўспомніць усё, дзеля чаго мы прыйшлі ў прафесію.

— У сацсетках тое, што адбывалася ў асобных палатах, называлі цудам. Напрыклад, калі пасля паўтара месяца на ШВЛ чалавек вярнуўся да звычайнага жыцця. Такіх выпадкаў нямала. Акрамя звышнатуральнага, ці ёсць аб'ектыўнае тлумачэнне такому цуду?

— Напэўна, у любой, нават самай складанай сітуацыі павінна быць месца цуду. І ў яго некалькі складнікаў. Многае залежыць не толькі ад прафесіяналізму медыцынскіх работнікаў. Важныя і выходныя даныя: як чалавек ставіўся да свайго здароўя да хваробы, ці меў шкодныя звычкі, спадарожныя захворванні, які быў агульны стан здароўя. Вельмі важны настрой, жаданне перамагчы хваробу, жыць здаровым і паўнавартасным жыццём. Мабыць, у гэтым крыецца сакрэт поспеху ў падобных крытычных сітуацыях.

— Працу ўрачоў і медсясцёр у гэты перыяд называюць подзвігам. Некаторых узнагародзілі да Дня медыцынскіх работнікаў, некаторыя прадстаўлены да ўзнагароды крыху пазней. Былі прадугледжаны таксама матэрыяльныя бонусы. Як лічыце, якая ацэнка для іх самая каштоўная?

— Самае каштоўнае для медыцынскага работніка — бачыць, як пацыенту, у якога ён уклаў столькі энергіі і сіл, становіцца лепш. Як, пазбавіўшыся ад хваробы, ён з удзячнасцю медыкам і верай у свае сілы працягвае жыць. Гэта самая галоўная ўзнагарода для нас.

— На фоне зніжэння колькасці хворых ці змяніўся рэжым бальніц і паліклінік рэгіёна?

— Вядома, установы аховы здароўя вярталі да звычайнага рэжыму на падставе аператыўнага аналізу колькасці пацыентаў з інфекцыяй COVID-19. Адноўлена таксама аказанне планавай медыцынскай дапамогі.

— Калі закрануць падтрымку галіны, то ці адчувалася ўвага з боку ўлады, прадпрыемстваў, грамадзян?

— Так, вядома, сістэма аховы здароўя Гомельскай вобласці атрымала адчувальную падтрымку і ад выканаўчай улады, і ад прадпрыемстваў, і, што таксама вельмі каштоўна, — ад грамадзян.

Дзякуючы дапамозе Гомельскага аблвыканкама з пачатку года набыта 39 апаратаў ШВЛ, тры аўтаматычныя аналізатары газаў крыві з камплектам рэагентаў і расходных матэрыялаў, 13 гемадынамічных маніторaў, 49 блокаў падачы кіслароду, кіслародныя інгалятары, увільгатняльнікі кіслароду і іншае неабходнае абсталяванне. Адрамантавалі і аднавілі сістэмы забеспячэння медыцынскімі газамі, дадаткова падключылі больш за 600 пунктаў падачы кіслароду.

Міністэрства аховы здароўя цэнтралізавана закупіла наборы рэагентаў для ПЦР-дыягностыкі і экспрэс-тэстаў для дыягностыкі каранавіруснай інфекцыі, сродкі індывідуальнай аховы і медыцынскае абсталяванне.

Усяго арганізацыі аховы здароўя рэгіёна атрымалі бязвыплатную дапамогу на суму больш за Br1,7 млн. Гэта і фінансавая падтрымка, і сродкі індывідуальнай аховы, і дэзсродкі, і медабсталяванне, і бытавыя прыборы.

Транспартныя арганізацыі Гомеля дапамагалі з дастаўкай з Мінска гуманітарных грузаў. Дзяржаўныя і прыватныя прадпрыемствы кожны дзень прывозілі гарачыя абеды медработнікам.

На сродкі, сабраныя простымі грамадзянамі і прадпрыемствамі горада, купілі сучасны апарат ШВЛ. Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа набыло перасоўны рэнтгенаўскі апарат. Пералічваць падобныя прыклады можна доўга. А вось сілу маральнай падтрымкі немагчыма перавесці ў лічбавы эквівалент. Мы ўдзячныя за ўсё.

— Як ацэньваеце дзеянні жыхароў рэгіёна? Ці на належным узроўні прыслухоўваліся да рэкамендацый урачоў?

— Трэба сказаць, што большасць грамадзян слухала парады ўрачоў і эпідэміёлагаў і выконвала меры бяспекі для зніжэння імавернасці інфіцыравання. Аднак, як і ва ўсе часы, асобныя грамадзяне катэгарычна не прымалі падобных мер і сваім прыкладам падштурхоўвалі блізкіх і знаёмых да такіх жа безадказных паводзін, а галоўнае — падвяргалі рызыцы сваіх блізкіх, калег па рабоце. Са зніжэннем узроўню захваральнасці насельніцтва на інфекцыю COVID-19 істотна знізіўся ўзровень мер па ўласнай ахове. У грамадскіх месцах толькі адзінкі надзяваюць ахоўныя маскі і карыстаюцца антысептычнымі сродкамі, хоць недахопу ў іх няма. Хацелася б яшчэ раз нагадаць людзям, што вірус не дрэмле і не шкадуе ні маладых, ні старых. І, умоўна кажучы, сёння, як і ўчора, выкананне элементарных мер бяспекі ўсё гэтак жа актуальна. Не падвяргайце сябе і блізкіх неапраўданай рызыцы.

— У Гомельскай вобласці ў тых, хто перахварэў на каранавірусную інфекцыю, пераважала лёгкая форма або выпадкі з ускладненнямі?

— Большасць пацыентаў у рэгіёне перанеслі каранавірусную інфекцыю ў лёгкай ці бессімптомнай форме. Разам з тым было нямала пацыентаў, якім спатрэбілася лячэнне ва ўмовах стацыянара, а таксама і ў рэанімацыйным аддзяленні. Часам захворванне прыводзіла да сумных наступстваў. Цяжэй яно працякала ў пацыентаў, якія мелі спадарожную хранічную сардэчна-сасудзістую і дыхальную паталогію. Асабліва часта развіваліся ўскладненні ў асоб пажылога ўзросту з трыядай: лішняя вага, цукровы дыябет і артэрыяльная гіпертэнзія.

Пакуль няма канчатковых статыстычных звестак пра ўсе наступствы захворвання, але папярэдне ўжо можна казаць, што наша сістэма аховы здароўя справілася з гэтым выклікам не горш за заходнееўрапейскія краіны.

— Якія высновы пасля сутыкнення з нявывучанай інфекцыяй былі зроблены на ўзроўні раёнаў вобласці?

— Мабыць, галоўная выснова — толькі сумесныя намаганнямі ўсяго грамадства мы здольныя супрацьстаяць падобным пагрозам і мінімізаваць іх наступствы.

— Зараз у некаторых еўрапейскіх краінах ідзе другая хваля віруса, уводзяцца каранцінныя меры. Ці гатовыя ў Гомельскай вобласці да падобнага?

— Перыяд стабілізацыі эпідэміялагічнай сітуацыі мы выкарыстоўваем для дадатковага ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы, у тым ліку па забеспячэнні гатоўнасці да магчымага ўздыму захваральнасці на COVID-19. Цяпер на балансе арганізацый аховы здароўя Гомельскай вобласці — 12 камп'ютарных тамографаў, каля 350 рэнтгенадыягнастычных апаратаў, больш за 430 апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх, у тым ліку дарослых, неанатальных (педыятрычных) і партатыўных. Усе ў рабочым стане.

У стацыянарах рэгіёна ёсць 1,6 тысячы пунктаў падключэння кіслароду, якія магчыма задзейнічаць для лячэння пнеўманіі, з іх — 476 у аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі. Працягваецца актыўная работа па арганізацыі дадатковых пунктаў падачы кіслароду.

Напярэдадні эпідэміялагічнага сезону росту захворвання на рэспіраторныя інфекцыі ў Беларусі плануецца штогадовая кампанія па вакцынацыі супраць грыпу. Аптымальныя паказчыкі прышчэпленасці, акрамя стварэння імуннай праслойкі сярод насельніцтва, дапамогуць звесці да мінімуму імавернасць выпадкаў мікст-інфекцыі — хваробы, выкліканай некалькімі патагеннымі мікраарганізмамі, што цесна ўзаемадзейнічаюць адзін з адным. Вакцынацыя супраць грыпу таксама паспрыяе зніжэнню нагрузкі на лячэбную сетку ў перыяд прагназаванай другой хвалі захваральнасці на COVID-19.

МОРА БЕЗ ФАРАОНАЎ,

або Ці ёсць турызм у перыяд пандэміі?

Распаўсюджванне каранавіруснай інфекцыі ў свеце, безумоўна, унесла свае карэктывы ў летнія планы адпачынку для ўсіх, і беларусы не выключэнне. Закрытыя граніцы іншых краін, актывізацыя ўнутранага турызму прымусілі многіх адмовіцца ад ранейшых планаў адправіцца на мора, але засталіся экстрэмалы, якія на свой страх і рызыку спакавалі чамаданы і рушылі... на курорт. Як выглядае адпачынак на папулярным у еўрапейцаў егіпецкім курорце Шарм-эль-Шэйх, мы раскажам вам зараз.

Пачну з таго, што гэтая паездка адбылася спантанна: не планавалі, не разлічвалі, а толькі марылі пра цёплыя воды якогасьці (нават міфічнага) мора, бо ўжо колькі гадоў там не былі... Раптоўна і нечакана пашанцавала — замаячыла некалькі дзён адпачынку. Таму разам з жонкай вырашылі пацікавіцца прапановамі тураператараў на цяперашні момант. Беглы прагляд водгукаў і стужак навін паказаў: беларусы могуць у жніўні адпачыць не так ужо і шмат дзе. А хацелася сонца і цёплага мора...

— Махнём у Турцыю? Чорнае мора, як-ніяк, да болю знаёмае, а? — пачала жонка «прабіваць» тэму.

— Можа, лепш параіцца з кімсьці, хто бачыў крыху далей за Чорнае мора? — прапаную ў адказ.

Сказана — зроблена. Найбліжэйшы офіс тураператара ад месца работы, рэйтынг якога па водгуках аказаўся самы высокі. Паўгадзіны на абмеркаванне дэталяў і... мара ўсё больш і больш набліжаецца да рэчаіснасці. У прыватнасці, вельмі цікавыя прапановы цяпер у егіпецкіх гатэляў, якія надта пакутуюць ад недахопу еўрапейскіх турыстаў, таму зніжаюць цэны на свае паслугі і становяцца больш прывабныя для турыста сярэдняй рукі. У параўнанні з папярэднімі сезонамі, кажуць тураператары, эканомія складае каля 30 %. Яшчэ адзін цікавы момант: танней набываць тур з вылетам з любога рэгіянальнага аэрапорта: яны ёсць і ў Гродне, і ў Віцебску, і ў Гомелі... Нам аказалася зручней ляцець з гродзенскага. Дарэчы, такое рашэнне ў параўнанні з прапановай вылету з Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» падоўжыла наш адпачынак на суткі за тыя ж грошы.

ЧАТЫРЫ ГАДЗІНЫ — І ТЫ НА КУРОРЦЕ!

Апроч пашпартнага і мытнага кантролю цяпер праводзіцца і медыцынскі, інакш кажучы, вымярэнне тэмпературы. Калі ўсё добра, можна ляцець! Сам палёт доўжыцца чатыры гадзіны: чартарны рэйс на «Боінгу-737» кампаніі «Белавія» звязвае Гродна і Шарм-эль-Шэйх. Наш борт першы адкрыў гэты напрамак, і цяпер палёты выконваюцца штотыднёва. Ці трэба казаць, што салон быў запоўнены цалкам, бо такіх прапаноў на турыстычным рынку даўно не было... Людзі сабраліся адпачыць цэлымі сем'ямі, з дзецьмі і нават бацькамі. А чаму б і не?!

Па прылёце — хуткі пашпартны кантроль, запаўненне ўсіх дакументаў: міграцыйных картак і загадзя запоўненых формаў, што ты не хворы на каранавірусную інфекцыю. Дарэчы, наконт гэтай навалы: з 1 верасня турыстам давядзецца мець пры сабе ПЦР-даследаванне на COVID, зробленае не пазней чым за 72 гадзіны да вылету. Нам пашчасціла — у гэты перыяд дастаткова было толькі запоўніць звычайную паперу, словам, пускалі на павер.

Яшчэ адзін відавочны плюс выбару гэтага напрамку — у летні перыяд не патрабуецца віза: набыў тур і ляці сабе без лішніх выдаткаў. Нават ранейшы турыстычны збор тураператар не бярэ, што таксама паўплывала на наша рашэнне. Адзінае, што параю — дадаткова аформіць страхоўку на выпадак захворвання на каранавірусную інфекцыю і неабходнасці вяртання іншым рэйсам. Але тут ёсць падводныя камяні: з моманту першага плацяжу за тур не павінна прайсці больш за два тыдні. Прычым пацвердзіць гэты факт у вас, хутчэй за ўсё, папросяць дакументальна, таму лепш усе банкаўскія квіткі аб аплаце пакуль прытрымаць у кішэні — сметніца пачакае.

АКЦЭНТ — НА ЎНУТРАНЫ ТУРЫЗМ

А цяпер пра сам адпачынак. Яго цяперашняй асаблівасцю можна назваць пэўнае зацішша. Не, гэта не значыць, што турыстаў няма, — яны ёсць, але ў параўнанні з папярэднімі сезонамі іх стала значна менш. Гатэлі, як мы заўважылі, таксама вытрымліваюць своеасаблівую сацыяльную дыстанцыю — многія стаяць пустыя ў чаканні іншаземных гасцей. На момант, калі мы засяліліся ў свой чатырохзоркавы гатэль, ён, здаецца, быў запоўнены працэнтаў на 40–50 % — не болей. Прычым сярод турыстаў са славянскай знешнасцю адпачывалі толькі нашы суайчыннікі і ўкраінцы. Расійскіх турыстаў заўважана не было (што і нядрэнна само па сабе, бо шумных пасядзелак у бары ніхто не ініцыяваў).

Сярод новых рэалій — змена акцэнтаў уладальнікаў гатэляў у бок адпачынку сваіх гасцей. Гаворка ідзе пра іх запаўненне за кошт унутранага турызму: арабскія сем'і выбіраюць гэты напрамак для адпачынку пераважна на ўік-энды. Скажу адразу, такое суседства было вельмі карыснае для знаёмства з іншым этнасам. Ну дзе ж яшчэ так шчыльна ты сутыкнешся з усходняй культурай?! Жанчыны ў хіджабах, паранджы (яны нават у басейне плаваюць у адмысловым касцюме) заўсёды побач са сваім мужам і дзецьмі. Адрозніваліся мы не толькі па знешнім выглядзе — у кожнага з нас былі рознага колеру бранзалеты: еўрапейцы насілі жоўтага колеру, што азначала «усё ўключана», арабы — зялёнага: без алкагольных напояў.

Трэба сказаць, што новыя рэаліі паўплывалі і на падыход да харчавання. Так званыя шведскія сталы нікуды не зніклі, толькі супрацоўнікі рэстарана (якія заўсёды былі ў масках і пальчатках) самі накладвалі ежу турыстам у любой колькасці — хоць пакуль разарвешся! Прыборы для харчавання таксама былі запакаваныя для кожнага асобна.

ТАРГУЙЦЕСЯ З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ

Але самы вялікі плюс Егіпта — гэта Чырвонае мора! Яно лагоднае, яркае і жывое. Абавязкова раю набыць маску для падводнага плавання: па-першае, трэба бачыць гэтую рыбную разнастайнасць і рознакаляровасць, па-другое, цэны знізіліся амаль удвая. Мае сябры набывалі такую ж маску летась за 25 долараў, мы ж — усяго за 12. Між іншым, зніжэнне цэн з-за адсутнасці турыстаў (унутраных не лічым, яны амаль нічога не набываюць) — толькі на руку! Таргуйцеся без сораму — і не пашкадуеце. Асноўная валюта на курорце — гэта амерыканскі долар, але і егіпецкі фунт, калі ён у вас ёсць, вітаецца. Цяперашні курс — 1 долар да 16 фунтаў.

Калі гатэль не ў цэнтры ці дзесьці побач, а, напрыклад, у новым раёне Набцы, смела бярыце маршрутку: іх кіроўцы пачнуць вас зазываць, як толькі вы выйдзеце за межы гатэля. Першапачатковая такса — долар з чалавека, але не забывайцеся пра торг: на самай справе за гэтыя грошы вы даедзеце ў цэнтр удваіх. Вяртацца можна такім жа чынам ці на таксі, за якое папросяць, як звычайна, больш, але 5 долараў (за 30 кіламетраў у дарозе) — канчатковая сума праезду за ўсіх, хто змесціцца ў салоне.

Сярод даступных забаў, акрамя паездкі ў цэнтр на мясцовы рынак, прапануюць яшчэ марскую вандроўку ці паездку па пустыні на квадрацыклах. На жаль, праз распаўсюджванне каранавіруснай інфекцыі ў Каіры (дарэчы, сярод турыстаў не было выяўлена ніводнага выпадку) наведванне знакамітых егіпецкіх пірамід пакуль знаходзіцца пад забаронай. Але нічога — мора ўсё кампенсуе! Асабліва яркім і запамінальным можа стаць купанне ў адкрытым моры: першы раз страшнавата, але потым — цэлы фантан эмоцый!

У ліку забароненых — вываз кавалкаў рыфаў, ракушак ды іншых марскіх «сувеніраў». Памятайце: каб не сапсаваць сабе ўспаміны пра адпачынак, лепш вяртацца не з такімі артэфактамі, а з іх выявамі, якія вы абавязкова зробіце на памяць у неверагоднай колькасці!

Сяргей ЭМБЕРГ,
фота аўтара.

Пласты гісторыі

Затануў, але стаў легендай

Навукоўцы абследавалі месца гібелі «Чалюскіна»

Адзначаецца, што мэтай работ было абнаўленне даных аб фактычным месцазнаходжанні легендарнага парахода, а таксама стварэнне трохмернай мадэлі яго стану. Навукоўцы правялі вадалазныя спускі для ідэнтыфікацыі і абследавання судна, затым былі аддадзены ўшанаванні загінуламу параходу, паведаміла Марвыратслужба Расмаррачфлоту.

Савецкі ледакольны пароход «Чалюскін» затануў 13 лютага 1934 года ў Чукоцкім моры ва ўмовах палярнай ночы і моцнага сціску лёду пасля амаль пяцімесячнага дрэйфу ў арктычных ільдах.

На лёд высадзілася 104 чалавекі, у тым ліку дзесяць жанчын і двое дзяцей. Аперацыя па выратаванні чалюскінцаў з лядовага палатачнага лагера з трыумфам завяршылася роўна праз два месяцы — 13 красавіка 1934 года — і стала першай у сусветнай гісторыі паспяховай буйнамаштабнай выратавальнай аперацыяй ва ўмовах Арктыкі.

Палярныя лётчыкі здзейснілі немагчымае. Менавіта для іх было заснавана самае ганаровае званне краіны — Герой Савецкага Саюза. Сем лётчыкаў сталі першымі яго ўладальнікамі.

Выратаванне чалюскінцаў паслужыла падставай для стварэння ў СССР магутнай палярнай авіяцыі і праграмы транспартнага развіцця арктычных абшараў.

Ад вінта!

Цяжкавоз для Арктыкі

ТАКІ БЕСПІЛОТНЫ ВЕРТАЛЁТ СТВАРЫЛІ Ў РАСІІ

Паветраны борт, здольны пераносіць грузы масай да 80 кілаграмаў на адлегласці да 200 кіламетраў ва ўмовах Крайняй Поўначы, распрацавалі расійскія інжынеры канструктарскага бюро «Русь». Р-2200 зможа прызямліцца на хісткую палубу карабля ці рухомую грузавую платформу, пішуць «Известия».

Грузы масай да 80 кілаграмаў складаюць большую частку трафіка ў цяжкадаступных раёнах Поўначы, Сібіры і Далёкага Усходу — гэта сярэдняя вага абсталявання для нафтаздабычы і геалагічнай разведкі. Доступ да такіх тэрыторый часта ёсць толькі па паветры. Некаторыя рэчы, напрыклад, лекі або апаратуру для навуковых даследаванняў, неабходна дастаўляць максімальна хутка.

Вылеты верталётаў каштуюць дорага — 70–150 тысяч расійскіх рублёў за адну гадзіну палёту. У сувязі з гэтым спатрэбіўся новы эканамічны сродак дастаўкі, які мог бы працаваць эфектыўна і безадмоўна ва ўмовах Поўначы.

Даўжыня беспілотніка — крыху менш за чатыры метры, шырыня — амаль паўтара. Гадзіна арэнды абыдзецца ўсяго ў 20 тысяч расійскіх рублёў, што выглядае істотнай эканоміяй у параўнанні са звычайным верталётам.

Чым меншая нагрузка, тым даўжэй верталёт зможа знаходзіцца ў паветры. З 80 кілаграмамі на борце ён зможа праляцець 80 кіламетраў, а з грузам у 60 кілаграмаў — да 200 кіламетраў.

Распрацоўшчыкі таксама плануюць выкарыстоўваць яго для разведкі мясцовасці, напрыклад, для складання папярэдняй карты залягання карысных выкапняў або атрымання інфармацыі аб лядовай сітуацыі ў моры.

Машына часу

Яго даследчыкі выявілі ў Новай Зеландыі

ЖЫВЫ СВАЯК ДЫНАЗАЎРАЎ

Адзіным жывым прадстаўніком старажытнага атрада рэптылій Rhynchocephalia, які меў агульнага продка з вымерлымі дыназаўрамі каля 250 мільёнаў гадоў таму, з'яўляецца гатэрыя, або туатара.

Як паведамляе часопіс Nature, іх дакладнае сваяцтва застаецца спрэчным, паколькі некаторыя вучоныя настойваюць на сувязі туатары з птушкамі, іншыя — з кракадзіламі або чарапахамі. Аднак новае даследаванне змясціла рэптылію ў эвалюцыйны ланцуг, агульны з яшчаркамі і змеямі.

На думку навукоўцаў, туатары аддзяліліся і самастойна існавалі каля 250 мільёнаў гадоў. Сустрэць іх можна ў Новай Зеландыі. Па словах суаўтара даследавання Марка Толіса з універсітэта Паўночнай Арызоны, геном туатары значна радзей мяняў ДНК, чым у іншых рэптылій, а іх малекулярны гадзіннік «цікаў» значна больш павольна.

Вельмі цікавіць даследчыкаў пытанне пра тое, як жывёла можа жыць больш за 100 гадоў. У сувязі з гэтым навукоўцы робяць спробы раскрыць генетычны код гэтых старажытных рэптылій.

«Геном туатары — гэта сапраўды машына часу, якая дазваляе нам зразумець, якія былі генетычныя ўмовы для жывёл, што змагаліся за сусветнае панаванне сотні мільёнаў гадоў назад», — расказаў вядучы аўтар даследавання Ніл Гемел з Універсітэта Атага.

Абліччы мінулага

ЯК ВЫГЛЯДАЎ НЕРОН?

Дызайнер паказаў выгляд рымскіх імператараў

Даніэль Вошарт стварыў поўнаколерныя і фотарэалістычныя партрэты 54 рымскіх кіраўнікоў, злучыўшы іх каменныя бюсты. Дызайнер склаў кампазіцыйныя малюнкі з дапамогай праграмы Artbreeder, паведамляе News.artnet.

Простыя карыстальнікі могуць проста дадаць два малюнкі ў праграму і яна сама іх злучыць як мага лепш. Але дызайнер загружаў на кожны партрэт дзясяткі малюнкаў бюстаў з выявай адпаведнага імператара. З дапамогай фотарэдактараў ён выдаліў расколіны, дадаў тэкстуру скуры і колер вачэй. Каб наблізіць іх да падабенства, дызайнер вывучаў сямейнае паходжанне імператараў, каб адгадаць колер скуры.

«Калі вы робіце фота рэалістычнымі, лёгка вылучыць з арыгінала любы выраз і характар. Я вельмі стараўся гэтага прытрымлівацца. Бюст Флавія, які я выкарыстаў у якасці зыходнага матэрыялу, не меў вялікай акадэмічнай вагі, але я лічыў, што гэты выраз быў захапляльны. Гэта трэба было захаваць. Чым больш выраз з'яўляецца нейтральным, тым цяжэй захоўваць фотарэалістычнасць».

Для папярэдніх праектаў Вошарт таксама выкарыстаў камп'ютарную праграму для стварэння партрэтаў егіпецкіх мумій і пераўтварэння серыі вобразных скульптур з гліны, створаных студэнтамі Нью-Ёркскай акадэміі мастацтваў, у рэалістычных асоб.

Карані няроўнасці

ЗАМОЖНЫЯ І СЫТЫЯ

Пра іх расказалі старажытныя пахаванні

Навукоўцы прааналізавалі косткі ранніх фермераў Еўропы, якія жылі 6600 гадоў таму, і выявілі, што разрыў ва ўзроўні дабрабыту мог існаваць значна раней, чым меркавалі спецыялісты.

Чэлсі Бадзі з універсітэта Умеа ў Швецыі і яе калегі прааналізавалі пахаванні абшчыны Осланкі ў Польшчы, каб паспрабаваць вызначыць, ці існавала няроўнасць у залежнасці ад 18 да 45 гадоў і аднаго дзіцяці. Каля 80 працэнтаў знойдзеных у гэтым раёне костак належала скаціне, група прааналізавала і іх. У костках тых, хто пахаваны з меддзю, быў выразны баланс суадносін ізатопаў вугляроду. Даследчыкі выявілі, што гэты незвычайны баланс быў таксама знойдзены ў костках буйной рагатай жывёлы, выяўленых у гэтым раёне. Гэта дазваляе выказаць здагадку, што людзі,

ад атрыманага багацця ў гэтых старажытных грамадствах, перадало ТСН са спасылкай на New Scientist.

Каманда спачатку выявіла, што чвэрць насельніцтва была пахавана з дарагімі меднымі пацеркамі, падвескамі і павязкамі на галаву. Але гэта не абавязкова азначае, што такія людзі былі багатыя пры жыцці. Таму Бадзі і яе калегі прааналізавалі ізатопы вугляроду і азоту ў касцях з магіл, якія могуць даць уяўленне аб якасці рацыёну на працягу жыцця. Каманда даследавала косткі 30 чалавек, якія жылі на працягу 200 гадоў, агледзелі 29 дарослых ва ўзросце пахаваныя з меддзю, елі мяса гэтых жывёл. Каманда Бадзі разважае, што названая жывёла магла пасвіцца на ярка асветленых адкрытых пашах, паколькі расліны, якія растуць на іх, павінны быць аналагічна абагачаны ізатопамі вугляроду. Такая ізатопная раўнавага не назіраецца ў раслін, якія растуць на менш прадукцыйных заценены дрэвамі пашах. Гэта сведчыць аб тым, што людзі, пахаваныя з меддзю, мелі доступ да земляў і скаціны, чаго не было ў іншых. Бадзі лічыць, што такая сітуацыя можа быць звязана з рознымі ўзроўнямі ўласнасці на зямлю і багацці.

Сяргей СТАРЫНАЎ.
Фота з адкрытых крыніц.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Айфономания. Тур 5»

В настоящих правилах проведения Рекламной игры **«Айфономания. Тур 5»** (далее – Правила) нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

Товары-партнеры – товары, указанные в таблице № 1 п. 8 настоящих Правил, а также на сайте интернет-магазина www.e-dostavka.by.

Рекламный игровой код — это семизначное число, которое присваивается участнику при соблюдении правил участия в Рекламной игре «Айфономания. Тур 5» (далее — Рекламная игра, Игра).

Розыгрыш — розыгрыш Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами Рекламной игры.

Участник — физическое лицо, которое приобрело один или несколько Товаров-партнеров и выполнило требования, необходимые для участия в Рекламной игре.

Кассовый (товарный) чек — документ, подтверждающий факт приобретения товаров, в том числе одного или нескольких Товаров-партнеров, который должен содержать сведения о номере документа, наименование продавца, дату продажи, наименование, количество и цену товара, итоговую сумму.

Фактом покупки товара в интернет-магазине www.e-dostavka.by является факт выдачи продавцом кассового и/или товарного чека после оплаты товара покупателем (получателем).

Персональные данные — совокупность личных данных физического лица, которые необходимо зарегистрировать (или проверить) в личном кабинете, а именно:

фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно),

адрес электронной почты (желательно);

абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно).

Сайт интернет-магазина — www.e-dostavka.by.

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», юридическое лицо согласно законодательству Республики Беларусь с местонахождением по адресу: г. Минск 220053, ул. Будславская, 2, оф. 11, УНП 191728827, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь решением от 23 августа 2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ЗАО «ИНТЕРНЕТ-МАГАЗИН ЕВРООПТ», Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Западный промузел, ТЭЦ-4, каб. 229.

3. Участники Рекламной игры.

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь или национальный паспорт той страны, гражданином которой он является, или документ, подтверждающий личность (для лиц без гражданства), и постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет (далее по тексту – Участники).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

4. Наименование Рекламной игры: «Айфономания. Тур 5».

5. Территория проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.

6. Срок начала Рекламной игры: 24 августа 2020 г.

7. Срок окончания Рекламной игры: 30 сентября 2020 г.

8. Наименования товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра: товары, реализуемые в Интернет-магазине e-dostavka.by на территории Республики Беларусь, с обязательной покупкой одного или нескольких следующих Товаров-партнеров:

Таблица № 1

№ п/п	Наименование товара	Количество начисляемых Игровых кодов
1	Colgate Optic White паста зубная Мгновенный, 75 мл	3
2	Colgate Plax Лечебные травы для десен, 250 мл	2
3	Colgate Plax освежающая мята, 250 мл	3
4	Colgate Plax Свежесть Чая, 500 мл	3
5	Colgate Plax Форте Кора дуба и пихта для десен, 250 мл	2
6	Colgate Plax Форте Кора дуба и пихта для десен, 500 мл	3
7	Colgate Plax Фруктовая свежесть, 250 мл	3
8	Colgate лента зубная Total фтор и мята	3
9	Colgate набор «Total» для комплексного ухода за полостью рта	4
10	Colgate набор для комплексного ухода за полостью рта «Безопасное отбеливание»	4
11	Colgate набор для комплексного ухода за полостью рта «Древние секреты»	4
12	Colgate ополаскиватель для полости рта Безопасное отбеливание, 250 мл	3
13	Colgate паста зубная «Безопасное отбеливание»: «Забота о деснах», 75 мл	3
14	Colgate паста зубная «Безопасное отбеливание»: «Природный уголь», 75 мл	3
15	Colgate паста зубная 0 % со вкусом нежной мяты, 130 г	3
16	Colgate паста зубная 0 % со вкусом перечной мяты, 130 г	3
17	Colgate паста зубная Elmex Caries Protection (Элмекс Защита от кариеса), 75 мл (new)	3
18	Colgate паста зубная Elmex Sensetive Plus (Элмекс Сенситив Плюс), 75 мл	3
19	Colgate паста зубная Max Fresh Взрывная мята, 100 мл	3
20	Colgate паста зубная Max Fresh Взрывная мята, 50 мл	1
21	Colgate паста зубная Max White/ МаксБлеск с отбеливающими пластинками, 100 мл	3
22	Colgate паста зубная Sensitive Pro-Relief, 75 мл	3
23	Colgate паста зубная Total 12 Профес чистка, 75 мл	3
24	Colgate паста зубная Total 12 Професс отбеливающая, 75 мл	3
25	Colgate паста зубная Total 12 Профессиональная Видимый Эффект 75мл	3
26	Colgate паста зубная Total 12 Профессиональная Здоровое Дыхание, 75 мл	3
27	Colgate паста зубная Гранат, 100 мл	1
28	Colgate паста зубная Древние Секреты «Безупречная свежесть», 75 мл	3
29	Colgate паста зубная Древние Секреты «Забота о деснах», 75 мл	3
30	Colgate паста зубная Древние Секреты «Укрепление эмали», 75 мл	3
31	Colgate паста зубная Макс Фреш Нежная мята, 100 мл	3
32	Colgate паста зубная Тройное действие 100 мл	1
33	Colgate сменные насадки к зубным щеткам Pro Clinical 150, питаемых от батарей, 2 шт.	3
34	Colgate щетка зубная 360 1+1	3
35	Colgate щетка зубная 360 с древесным углем	3
36	Colgate щетка зубная Pro Clinical 150, питаемая от батарей	3
37	Colgate щетка зубная Бамбук Древесный уголь	3
38	Colgate щетка зубная Бамбук Древесный уголь Промопак	3
39	Colgate щетка зубная Древесный уголь ЗигЗаг 2+1	2
40	Colgate щетка зубная ЗигЗаг Древесный уголь	1
41	Colgate щетка зубная Тройное действие двойная упаковка	1
42	Colgate щетка зубная Ультрамягкость	3
43	Colgate щетка зубная Шелковые Нити с древесным углем (Slim Soft Charcoal) 1+1	3
44	Colgate щетка зубная Шелковые Нити Ультра	3
45	Colgate щетка зубная Эксперт Чистоты 3+1	3
46	Colgate щетка зубная электрическая 360 Optic White	3
47	Colgate щетка зубная электрическая Супермягкие щетинки (Barbie/Spiderman)	3
48	Lady Speed Stick 24/7 Невидимая защита гель, 65 г	3
49	Lady Speed Stick 24/7 Свежесть облаков, 45 г	3
50	Lady Speed Stick 24/7 Невидимая защита, 45 г	3
51	Lady Speed Stick Алоэ для чувст. кожи, 45 г	3
52	Mennen Speed Stick Энергия Стихии Снежная лавина, 60 г	3
53	Mennen Speed Stick Энергия Стихии Снежная Лавина гель, 85 г	3
54	Palmolive Intimo мыло жидкое для интимного ухода Natural Care (с экстрактом ромашки), 300 мл	3
55	Palmolive Men гель для душа и шампунь 2 в 1 Цитрусовый заряд, 750 мл	3
56	Palmolive гель-крем для душа Натурель олива, 250 мл	3
57	Palmolive гель-крем для душа Натурэль Витамин В и Гранат, 250 мл	3
58	Palmolive гель-крем для душа Натурэль Витамин С и Апельсин, 250 мл	3
59	Palmolive гель-крем для душа Натурэль Витамин С и Апельсин, 750 мл	3
60	Palmolive крем-гель для душа Гурмэ СПА Ежевичный мусс, 250 мл	3
61	Palmolive крем-мыло жидкое Натурэль Витамин С и Апельсин, 300 мл	3
62	Palmolive мыло жидкое Натурэль олива и увлажняющее молочко, 300 мл	3
63	Palmolive мыло туалетное Натурэль с экстр. оливы и увл. мол. 5*70 г	2
64	Palmolive шампунь кондиционер 2 в 1 Palmolive Натурэль. Живой цвет с экстрактом граната и УФ-фильтром, 380 мл	3
65	Palmolive шампунь кондиционер 2 в 1 Palmolive Натурэль. Против перхоти и выпадения волос, 380 мл	3
66	З/паста «COLGATE» (Проф. чистка, гель), 75 мл	3
67	Зубн. паста «COLGATE» (дет 6-9с фторидом), 60 мл	3
68	Зубн. паста «COLGATE TRIP. ACT» (or.m), 150 мл	2
69	Зубн. паста «COLGATE» (береж. отбел.), 100 мл	1
70	Зубн. паста «COLGATE» (креп. зубы), 100 мл	1
71	Н-р «PALMOLIVE MEN» (гель д/д 250+мыло, 90 г)	3
72	Н-р «PALMOLIVE» (гель д/душа 250 мл + мыло, 2 шт.)	3

Полный перечень Товаров-партнеров, участвующих в Рекламной игре, указан также на сайте интернет-магазина www.e-dostavka.by

9. Призовой фонд Рекламной игры.

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Заинтересованного лица (ЗАО «ИНТЕРНЕТ-МАГАЗИН ЕВРООПТ») в размере 17 223,00 (семнадцать тысяч двести двадцать три) белорусских рубля 00 копеек. Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы (далее – Призы):

Таблица № 2

Приз	Кол-во, шт.	Номинал за ед., бел. руб.	Всего стоимость, бел. руб.
Приз 1			
Смартфон Apple iPhone 11 PRO 64 GB Midnight Green, Model A2215, MWC62RM/A	5	2 580,00	12 900,00
Денежное вознаграждение		364,60	1 823,00
Приз 2			
Подарочный сертификат на покупку товаров в интернет-магазине e-dostavka.by, номиналом 50 рублей Срок действия: 17.09.2020–16.10.2020	50	50,00	2 500,00
ИТОГО			17 223,00

10. Порядок участия в Рекламной игре.

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо:

- в срок с 24.08.2020г. по 13.09.2020 г. включительно совершить покупку на сайте Интернет-магазина www.e-dostavka.by на сумму не менее 80,00 белорусского рубля любых товаров, в том числе 1 либо несколько Товаров-партнеров, указанных в таблице № 1 п. 8 настоящих Правил.

- в срок с 00:00:00 24.08.2020 г. по 23:59:59 13.09.2020 г. достоверно заполнить Персональные данные (либо проверить корректность ранее заполненных данных) и подтвердить согласие на участие в Рекламной игре в личном кабинете.

В случае если Персональные данные и согласие на участие в рекламных мероприятиях было подтверждено ранее, повторное подтверждение не требуется.

10.2. Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.).

Каждому покупателю, который совершил действия, указанные в п. 10.1 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного, Игровой код на дату и время выдачи продавцом кассового и/или товарного чека после оплаты товара покупателем (получателем).

11. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших Участников Рекламной игры:

11.1. В розыгрыше Призов участвуют Игровые коды, начисленные за покупки только тех участников, которые указали необходимые Персональные данные в личном кабинете и подтвердили свое согласие на участие в Рекламной игре в сроки, указанные в п. 10.1 настоящих Правил.

11.2. Участник, не выполнивший действия, указанные в п.10, не участвует в Розыгрыше Призов.

11.3. Розыгрыш Призов проводится в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Будславская, 2, оф. 11.

К моменту розыгрыша Призов Организатором формируется Список Игровых кодов по возрастанию, сформированный согласно п. 10.2 настоящих Правил (далее — Список), с указанием фамилии, имени, отчества Участников, даты и времени выдачи продавцом кассового и/или товарного чека, а также даты и времени подтверждения согласия на участие в Рекламной игре. Все Игровые коды имеют одинаковую разрядность.

Таблица № 3

Дата и время розыгрыша	Участвуют Игровые коды, присвоенные за покупку, совершенные в период	Участник подтвердил свое участие в Игре, заполнив Персональные данные в личном кабинете	Призы для розыгрыша
17.09.2020, в 13:30	с 24.08.2020 (00:00:00) по 13.09.2020 (23:59:59)	не позднее 23:59:59 13.09.2020	Приз 1, 5 штук. Приз 2, 50 штук

Вышеуказанные Призы разыгрываются в порядке, указанном в Таблице № 3.

11.4. Определение победителей Призов «Приз 1», «Приз 2»:

Для проведения розыгрыша используется лототрон и 10 одинаковых непрозрачных шаров с цифрами от 0 до 9 внутри. Определение номеров Победителей происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона. Для определения первой слева цифры номера Победителя лицо, проводящее розыгрыш, помещает в лототрон шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера Участника согласно соответствующему списку. Шары перемешиваются, из лототрона путем случайной выборки извлекается шар, номер которого определяет искомую цифру. Для определения второй и последующих цифр номера Победителя в лототрон загружаются все десять шаров. После извлечения каждого шара производится проверка на соответствие полученной комбинации цифр номеру Участника согласно соответствующему списку. При отсутствии полученной комбинации цифр в номерах по списку извлеченный шар не возвращается в лототрон, а лицо, проводящее розыгрыш, извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация не совпадет с номером Участника по списку. Процедура повторяется до определения 5 (Пяти) Победителей Приза 1 и 50 (Пятидесяти) Победителей Приза 2.

11.5. Результат Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, подписанном присутствующими на заседании членами комиссии.

12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша.

12.1. Победители Призов «Приз 1» и «Приз 2» извещаются о выигрыше не позднее 22.09.2020 посредством уведомления на адрес электронной почты, указанный при регистрации в личном кабинете на сайте интернет-магазина, а также SMS-рассылки на абонентские номера мобильных телефонов сотовых операторов.

12.2. Для получения Призов Победителям необходимо выполнить следующие действия:

- для получения Приза 2 Победителю необходимо осуществить активацию электронного подарочного сертификата в разделе «Мои промокоды» в личном кабинете на сайте Интернет-магазина при совершении покупки в срок не позднее 16.10.2020. Подарочные сертификаты будут доступны для активации в личном кабинете Победителя в день розыгрыша.

- Для получения Приза 1 Победитель должен приехать в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Будславская, 2, оф. 11 в будние дни с 10.00 до 16.00 в период с 23 сентября 2020 года по 30 сентября 2020 года, а также в субботу 26 сентября 2020 года с 10.00 до 13.00, предварительно связавшись с Организатором по телефонам: +375 17 363 02 76, +375 17 363 12 78.

12.3. Для получения Приза 1 Победитель обязан предъявить паспорт гражданина Республики Беларусь (или вид на жительство), национальный паспорт той страны, гражданином которой он является, или документ, подтверждающий личность (для лиц без гражданства), а также подписать все необходимые документы, связанные с получением приза.

12.4. В соответствии с главой 16 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении Приза 1 выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из денежных средств Приза 1.

12.5. Организатор не оплачивает Победителям Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения призов.

12.6. В случае если Победителем Рекламной игры является несовершеннолетний Участник, призы выдаются законному представителю (родителю, усыновителю, попечителю) при предъявлении паспорта гражданина Республики Беларусь / вида на жительство на территории Республики Беларусь законного представителя и свидетельства о рождении ребенка (иного документа, подтверждающего представительство несовершеннолетнего лица).

12.7. В случае если Победитель не может получить Приз 1 лично, Приз 1 может получить его доверенное лицо по предъявлении своего паспорта (вида на жительство) и доверенности от Победителя, заверенной нотариально, а также подписать все необходимые документы, связанные с получением приза.

12.8. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

12.9. Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с призами, возникшие после передачи Победителям.

12.10. В случае если призы не получены в установленные Правилами Рекламной игры сроки призы остаются в распоряжении Организатора.

13. Комиссия по проведению Рекламной игры, регламент деятельности.

13.1. Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам, и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

- Петраков Никита Сергеевич, специалист отдела маркетинга, ЗАО «Интернет-магазин Евроопт»;

- Ананич Михаил Михайлович, заместитель директора ООО «АМК «РЭПКА»;

- Прыгунова Ольга Юрьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА»;

- Чикилева Елена Александровна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА»;

- Костюк Дарья Валерьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА».

14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.

14.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 25.09.2020 включительно.

14.3. Имена Победителей Рекламной игры будут размещены на сайте Интернет-магазина.

14.4. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить по телефону горячей линии: 440 с 08.30 до 20.30.

15. Прочие условия

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами, и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

15.2. Участники Рекламной игры, претендующие на получение приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые для получения выигрыша документы, предоставляемые Организатором Рекламной игры.

15.3. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и(или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

15.4. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

15.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке, согласно законодательству Республики Беларусь.

15.6. Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, ул. Будславская, 2, оф. 11.

Свидетельство № 3837 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 19 августа 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ШТО НА ПАВЕРХНІ, А ШТО — УНУТРЫ?

Як я была ўдзельніцай «канфлікту» на экзамене па медыяцыі

Маладая пара з двума дзецьмі жыве ў двухпакаёвай кватэры. Дачка сёлета ідзе ў школу, мама Ксенія з гадавалым сынам у дэкрэце. Бацька Анатоль працуе на двух работах, каб утрымліваць сям'ю. Яго маці Мар'я Пятроўна жыве ў аднапакаёвай кватэры, якая належыць Анатолю, а сваю «трошку» здае ў арэнду і ўсе грошы забірае сабе. Праблема, з якой яны прыйшлі да медыятара, напачатку гучала так: маладой пары не хапае грошай на жыццё і месца ў кватэры. Праз гэта нявестка са свякроўю лаяліся, а Анатоль ніяк не мог іх памірыць. Пагаварыць нармальна не атрымліваецца, таму дапамогу вырашылі шукаць у медыятара...

Такім першапачаткова быў сцэнарый канфлікту, разбірацца ў якім павінна была Таццяна, каб здаць экзамен на права атрымаць пасведчанне медыятара. Іспыт праводзілі ў цэнтры «Медыяцыя і права», які ўжо навучыў асновам медыяцыі каля 600 чалавек. Усе ўдзельнікі гульні-выпрабавання — спрачальнікі — бачыліся ўпершыню, таму падыграць адно аднаму не маглі. Здавалася б, кожны проста выконваў ролю, аднак за час іспыту ўсе так у іх уцягнуліся, што літаральна пражылі кавалачак жыцця сваіх герояў і адчулі іх клопаты. Настолькі, што ў выніку медыяцыйнай сустрэчы выйшлі на рэальныя прычыны канфлікту, якія нарадзіліся тут жа, падчас гульні. Мне на гэтым іспыце дасталася роля нявесткі, і скажу адразу, што пісаць пра гісторыю пары і ўдзельнічаць у стварэнні гісторыі — вялікая розніца. Аказалася, што прычына канфлікту не ў тым, пра што гаварылася напачатку. Ксенія прагне зусім не грошай, а Мар'я Пятроўна не давярае нявестцы і падазрае яе ва ўсякіх злачынствах, сама ж пры гэтым мае таямніцу...

ЗНЕВАЖАЦЬ НЕЛЬГА ВЫКАЗВАЦЦА

Напачатку сустрэчы кандыдат у медыятары Таццяна абвясціла, што мерапрыемства запланавана на 2-2,5 гадзіны, і прапанавала зрабіць неадкладныя званкі і завяршыць усе іншыя тэрміновыя справы, каб пасля не адцягваць увагу. Кожны з удзельнікаў пацвердзіў, што прыйшоў на працэдуру добраахвотна, бо гэта адзін з галоўных прынцыпаў удзелу ў ёй.

— Медыяцыя — нефармальны працэс урэгулявання вашай праблемнай сітуацыі з удзелам медыятара — незалежнай бесстаронняй асобы, — абазначыла Таццяна і нагадала некалькі правіл сустрэчы і прынцыпаў медыяцыі. — Прашу вас паважліва ставіцца адно да аднаго, не крычаць, не зневажаць, не перапыняць таго, хто гаворыць. Калі нехта не згодны з выказваннем, пазначайце на аркушах паперы інфармацыю, якую хочаце ўдакладніць. Каб вытрымаць канфідэнцыяльнасць, усё, што вы напішаце, застанецца тут. Тэлефонныя і дыктафонныя запісы размоў таксама лепш не весці. Я як медыятар не займаю пазіцыю ніводнага з бакоў, вытрымліваючы прынцып бесстароннасці. Дарэчы, гэтак жа добраахвотна, як вы прыйшлі на сустрэчу, вы таксама можаце і сысці з медыяцыі.

— Калі хтосьці з вас пажадае дадаць нейкі каментар, які не хоча агучваць перад усімі, зрабіць гэта можна падчас індывідуальнай размовы, якую на 15 хвілін я забяспечу кожнаму з бакоў. Пра гэтыя звесткі другі бок не даведаецца, калі вы не захочаце, — дадала Таццяна.

Адразу пасля гэтага Анатоль выказвае незадавальненне:

— Я б не хацеў, каб мае дзяўчынкі нешта без мяне абмяркоўвалі. Я не хачу нічога ад мамы хаваць. Тут селі і тут будзем размаўляць.

— У вас будзе магчымасць прадукцыйна абмеркаваць усё. Аднак індывідуальныя размовы прадугледжаны працэдурай, — тлумачыць Таццяна.

— Яны індывідуальна ўжо наскандаліліся. Мы прыйшлі сюды мірыцца! Пакуль не дамовімся, не пойдзем адсюль. Надакучылі лаянкі дома!

Такім чынам мы ўвайшлі ў медыяцыю-гульню.

ГРОШЫ, ДЗЕЦІ, КАТЛЕТЫ...

Таццяна прапанавала Ксеніі выказацца першай. Анатоль адразу ўзвіўся: «Гэта ты прасіла, каб маму на другі план адсунулі?» — «Ды ні ў якім разе, проста медыятар бачыць, пэўна, у каго добрэйшы твар», — рэагуе Ксенія.

— Мы павінны выслухаць сёння ўсё пра канфлікт, каб зразумець, які шлях рашэння можна знайсці, — узяла ініцыятыву ў рукі медыятар. — Тым больш што пагадненне аб прымірэнні падпісана менавіта з Ксеніяй.

— Матэрыяльнае становішча ў нас цяжкае, а не нармальнае, як лічыць Толік. Дачку ў школу збіраць, малодшаму трэба ўжо прыкорм уводзіць нармальны. А мама твая ўсе грошы сабе забірае, магла б і падзяліцца. Мы ўжо два варыянты рашэння праблемы з ім прыдумалі. Мы ўчатырох маглі б пераехаць у «трошку», а маю двухпакаёўку здаваць, а грошы напалам дзяліць, мы не сквапныя. Другі варыянт — мы працягваем жыць дзе жывём, а Мар'я Пятроўна няхай падзеліцца з намі грашыма. Яна не пагаджаецца ні на адзін з варыянтаў, кажа, што ёй трэба для сябе пажыць, — агучвае праблему Ксенія.

Наступнаму прапануюць выказацца Анатолю:

— Ну, не ўсё так адназначна. У гэтай кватэры мы жывём даўно. Яшчэ да вяселля мы з Ксюшай абмяркоўвалі, як будзем жыць. Трохпакаёвая кватэра належыць маім бацькам. Для мяне яны да вяселля яшчэ пабудавалі аднапакаёўку. А як вырашылі ажаніцца, то пераехалі да Ксеніі жыць, а аднапакаёўку здавалі. І ўсе сябравалі. А потым у нас дзеці пайшлі. Бацька мой памёр, брат ажаніўся. Маме ўжо тая трохпакаёўка і не патрэбная. Яна ў маю пераехала, а бацькоўскую здаваць сталі. А потым яны раптам пасварыліся тыдні два таму, і панеслася. Чаго Ксеніі не хапае, не разумею. Можа, ёй сумна стала ў дэкрэце, яна ж у мяне актыўны чалавек. Бо мама і дзяцей глядзіць, і часам грошы дае. І нявестцы вось 100 долараў на юбілей падарыла. Унучка захацела ровар — бабуля купіла, на поўдзень яе звазіла адпачыць, да 1 верасня завушніцы падарыла дарагія. Маці сваёй я не вораг, высяляць яе не буду. Я хоць дома і рэдка бываю з-за дзвюх работ, але хачу спакою ды цішыні. Можа, вы памірыцеся, бо жыцця няма, хоць з хаты ўцякай.

Анатоль так разышоўся, так абурыўся, што цалкам запаланіў сабой інфармацыйную прастору. Нават медыятар яго ледзьве прыпыняла.

— Я сябе адчуваю непатрэбнай. Ты сядзіш і маму сваю падтрымліваеш. Яна тое, яна гэта, — не вытрымлівае ўрэшце Ксенія. — А ты ведаеш, як яна са мной размаўляе, пакуль цябе няма?

Калі надыходзіць чарга выказацца Мар'і Пятроўне, яна чамусьці пачынае настойваць на тым, каб спачатку пагаварыць асобна з медыятарам:

— Ёсць некаторыя рэчы, якія я не хацела б выносіць перад усімі. Я магу сказаць толькі пра свае апасенні.

— Яна што, загуляла, пакуль мяне не было?! — узрываецца Анатоль.

— Вось сваімі недагаворкамі да чаго давялі. Вы што, нас развесці хочаце?! — крычыць і Ксенія.

Пачынаецца вэрхал.

— Фіксуйце свае каментарыі, у тым ліку і адно да аднаго, на паперы, не павышайце голас, — нагадвае медыятар, супакойваючы спрачальнікаў, і прапануе выказацца другому боку — свекрыві.

— Мой сын і Ксенія даўно жанатыя. У мяне цудоўныя ўнукі. Я дагэтуль перажываю смерць мужа, а нявестка стала мне радзей даваць унукаў, асабліва маленькага. Я не разумею, чаму раптам Ксеніі спатрэбілася гэтая кватэра. Навошта ёй, каб я аддавала палову грошай ад арэнды? На што ёй не хапае? Ну, пераеду я назад у сваю трохпакаёвую, а раптам яны з сынам разыдуцца і ёй кватэра сына аднапакаёвая дастанецца? Я не давяраю нявестцы! Думаю, яна хоча «развесці» майго сына на грошы.

— Ды шмат на што трэба грошай! У нас рамонту не было ўжо дваццаць гадоў! — усхопліваецца нявестка. — І што вы ўсё пра развод кажаце?! Я яму двух дзяцей нарадзіла! Я табе не казала, Толік, не хацела, але мама твая мяне крытыкуе бясконца. Катлеты нясмачныя, боршч надта тлусты, бардак у кватэры...

ПРЫЧЫНЫ — НАДУМАНЫЯ, ЭМОЦЫІ — САПРАЎДНЫЯ

Пасля кароткага эмацыянальнга выбуху Мар'я Пятроўна нарэшце кажа, чаму падазрае нявестку. Аказваецца, яна ўбачыла ў той на камп'ютары адкрытыя старонкі з запытамі «Як прадаць «аднушку» і «Як пераафарміць кватэру» і вырашыла, што Ксенія збіраецца адабраць у сына маёмасць.

Нявестка тут жа тлумачыць, што піша артыкул пра нерухомасць, таму і глядзела, што ў сеціве на гэты конт пішуць. Хоць яна і ў дэкрэце, але ж старацца не траціць кваліфікацыю, абстрагавацца ад хатніх клопатаў, ды і грошы сапраўды дадатковыя.

Анатоль прапануе ўсім разыходзіцца, раз у гэтым прычына. Ён для сябе ўжо вызначыўся і гатовы далей сам разбірацца з блізкімі.

Пачынаецца чарговая эмацыянальная сварка, якую Таццяна перапыняе прапановай даць магчымасць спрачальнікам выказацца падчас індывідуальных размоў па 15 хвілін.

І вось ужо пасля гэтага высвятляюцца дадатковыя акалічнасці і сапраўдныя прычыны канфлікту.

Медыятар ізноў заклікае паважаць адно аднаго. Атмасфера між тым распальваецца. Тым не менш у адказ на кожную прэтэнзію мамы і жонкі Анатоль дыктуе рашэнне, нават не пытаючыся, што яны пра гэта думаюць. Ды і на Таццяну пачынае пакрыкваць. Але першая зрываецца на крык менавіта свякроў, якая пагражае сысці з медыяцыі, калі ёй не дадуць пагаварыць з медыятарам асобна.

— Толік, мне здаецца, ты да мяне ставішся не так, як раней. У цябе мама на першым месцы! Мне не хапае тваёй увагі. Замест цябе твая мама перад вачыма ўвесь час, — не вытрымлівае Ксенія.

— Давай толькі без гэтага, ты мне ўльтыматумы не стаў. Чаго табе не хапае? З раскошы шалееш? Твая першасная задача — маленькі сын. Хочаш на работу — ідзі працуй. Толькі я малога глядзець не магу. На работу ездзіў, езджу і буду ездзіць! — выносіць вердыкт Анатоль. — З дэкрэту выйдзеш — будзе табе павага. Хочаш слоў пяшчотных — напішы, буду табе чытаць.

Медыятар спрабавала дастукацца да пачуццяў Анатоля, аднак той цвёрда стаяў на сваім.

Агучыла ўголас урэшце пасля індывідуальных размоў сваю таямніцу і Мар'я Пятроўна. Аказваецца, грошы ёй патрэбныя на лячэнне, яна не хацела хваляваць сына... Пры гэтым яна нават пабойваецца яго нахрапістасці, хоць і любіць, і шкадуе.

Гэтаксама як і Ксенія, якая і прагне ўвагі мужа, і крыўдуе, і шкадуе, што ён на дзвюх работах. Толькі каб дапамагчы яму, яна хапаецца за ўсё адразу: ці працаваць, ці большую кватэру знайсці, каб для адпачынку больш магчымасцяў было...

Тут панеслася пановай. Ксенія адразу адмовілася ад прэтэнзій на грошы і пераезд. «Мы спраўляемся ў двухпакаёўцы, яшчэ патрываем, пакуль вы не назбіраеце патрэбную суму, а «трошку» ж даражэй здаваць». Мар'я Пятроўна пагадзілася схадзіць да натарыуса, каб той пацвердзіў ёй, што нявестка з кватэрай сына сапраўды зрабіць нічога не зможа, нават у выпадку разводу. А Анатоль супакоіўся, што паміж «яго дзяўчынкамі» ўсё высветлілася, непапраўнага не здарылася, а мяняць нешта тэрмінова і не трэба.

...Мы ўсе так ужыліся ў ролі, што калі прайшло амаль 2,5 гадзіны, нават гэтага не заўважылі і працягвалі «вырашаць праблемы». Невядома, да чаго б яшчэ «дакапаліся», калі б нас не перапынілі экзаменатары. Цяпер магу на вопыце сказаць, наколькі гэта складаная і важная справа — мірыць людзей, тым больш калі ты іх не ведаеш. Магчыма, адносіны ў нашых герояў і не адразу палепшацца, аднак яны дакладна не стануць горшыя, бо людзі пагаварылі і пачулі адно аднаго. Як правіла, менавіта гэта і трэба зрабіць, каб не страціць тое, што існуе. А выслоўе «лепш мірыцца, чым судзіцца» сапраўды працуе.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Зноў няма чаго надзець?

Папаўняем гардэроб напярэдадні халоднага сезона

Якімі б цяжкімі і хвалюючымі ні былі вясна і лета сёлета, наперадзе нас чакае восень, за ёй прыйдзе зіма — жыццё працягваецца. Такім чынам, абнаўляем гардэроб да халоднага сезона з улікам парад стылістаў.

OVERSIZE: НЯЛІШНІ АБ'ЁМ

Аверсайз — найбольш актуальны сілуэт восені — 2020 і будучай зімы. Іншымі словамі, «у абліпку» цяпер — антытрэнд: актуальныя рэчы павінны пакідаць паміж сабой і вашым целам паветраную праслойку. Вырабы крою аверсайз лагічна падтрымліваюць іншы трэнд восені, які быў актуальны і ў мінулым халодным сезоне, — мнагаслойнасць. Гэтай восенню і зімой Oversize прытрымліваюцца абсалютна любыя вырабы — кашулі і спадніцы, сукенкі і джынсы, паліто і трэнчы, касухі і штаны.

Але варта памятаць, што аверсайз каварны: з ім трэба ўмець «дамовіцца». У адваротным выпадку вы рызыкуеце, няўдала спалучыўшы трэндавыя аверсайз-рэчы, выглядаць так, нібы месяц стаялі ў пераходзе з таблічкай: «Самі мы не мясцовыя, дапамажыце, людзі добрыя», і вам дапамаглі рэчамі — хто чым мог.

Калі вы толькі асвойваеце гэты трэнд, пачніце з «верху» — худзі, світар, талстоўка. Каб скласці вобраз з джынсамі або штанамі-аверсайз, трэба трохі патрэніравацца. Памятайце: у вобразе павінна быць адна рэч «большага, чым трэба, памеру», астатнія няхай падкрэсліваюць далікатнасць вашай фігуры. Аверсайз дадае аб'ёмаў, але гэтага можна пазбегнуць, калі не хаваць тонкія шчыкалаткі і запясці — тады «вялікая» рэч надасць вам далікатнасць, а не зробіць падобнай на манумент. Лёгкасці дадае сілуэту і абутак на абцасах.

Яшчэ адзін нюанс. Чамусьці склалася меркаванне, што рэчы Oversize прыдуманыя для таго, каб хаваць пад імі лішнія кілаграмы (напэўна, у народнай свядомасці гэтаму паспрыялі любімыя лукі Алы Пугачовай). На жаль, гэта не так. Аверсайз здольны толькі трохі палепшыць абрысы шырокіх сцёгнаў ці не занадта стройнай таліі, калі гэта — вашы праблемныя зоны. Але калі вы — уладальніца пышных формаў, для рэчаў аверсайз адмоўцеся ад чорнага колеру: у гэтым выпадку фігура будзе выглядаць не больш стройнай, а наадварот, больш цяжкай і нават пагрозлівай.

Намякнуць, што пад вялікім світарам схавана вытанчаная жаноцкасць, дапаможа шырокі пояс на таліі. Бонус: аверсайз-сукенка, світар, кашуля плюс шырокі пояс, і талія будзе здавацца танчэйшай.

МІДЗІ: САМА ЖАНОЦКАСЦЬ

Самая жаноцкая даўжыня спадніц і сукенак — мідзі — будзе найбольш актуальнай гэтай восенню і зімой. Яна, дарэчы, самая зручная і дэмакратычная, і ствараць лукі са спадніцамі і сукенкамі гэтай даўжыні прасцей, чым з міні або максі. Падыдзе даўжыня мідзі ўсім, але жанчынам маленькага росту варта быць з ёй асцярожнымі: мідзі можа візуальна скараціць ногі і «з'есці» рост. Каб гэтага не адбылося, выбірайце абутак, верхні край якога будзе закрыты падолам спадніцы-міді (напрыклад, боты-батфорты). Ідэальна, калі абутак і спадніца будуць супадаць па колеры.

МНАГАСЛОЙНОСЦЬ: ПА ПРЫНЦЫПЕ КАПУСТЫ

Гэты трэнд на піку папулярнасці ўжо не першы халодны сезон, і мы з ім быццам бы ўжо асвоіліся. І гэта добра: вільготнай і золкай беларускай позняй восенню і зімой слаі адзення трымаюць цяпло, і пры гэтым мы выглядаем стыльна і актуальна. Пры стварэнні мнагаслойнага лука важна, як заўсёды, памятаць некалькі правілаў. Першае: кожны новы пласт — шчыльнейшы, чым папярэдні. Другое: збіраем шматслаёвы сэт, ствараючы «лініі». «Лініі» могуць быць гарызантальныя або вертыкальныя. Вертыкальныя — зрокава выцягваюць сілуэт і візуальна дадаюць росту. Гарызантальныя — больш звыклыя. Ствараючы шматслаёвы вобраз з гарызантальнымі лініямі, мы апранаем больш доўгія прадметы гардэробу бліжэй да цела, а наверх — тыя, што карацейшыя. І кожная рэч трохі выглядае з-пад наступнай. Стварыць шматслаёвы вобраз з вертыкальнымі «лініямі» дапамогуць рэчы на маланцы, гузіках і іншых зашпільках — нешта зашпільваем, нешта пакідаем расшпіленым. Трэцяе правіла датычыцца колькасці слаёў і колераў: пластоў у шматслаёвым вобразе стылісты раяць выкарыстоўваць ад чатырох да пяці, колераў — не больш за два.

ТАЛІЯ НА ТАЛІІ: У ДОБРАЙ ФОРМЕ

Менавіта вырабы, якія трымаюць форму, робяць вобраз актуальным. Бясформенныя, мяккія, бесхарактарныя — скідаем з карабля гісторыі. Асабліва здольнасць трымаць форму важная для паліто і пінжакоў — тут выразная лінія пляча абавязковая. Штаны, сукенкі і спадніцы таксама павінны трымаць форму. Гэта, дарэчы, дапаможа зрабіць блізкай да ідэалу любую фігуру.

Нарэшце талію вярнулі на яе законнае месца! І вось ужо які сезон яна больш не зрушваецца ні вышэй, ні ніжэй. Актуальная пасадка джынсаў і штаноў — высокая. У такога крою ёсць як плюсы, так і мінусы. Плюсоў больш. Ногі здаюцца даўжэйшымі, а паясніца не мерзне. Цела не агаляецца, калі вы садзіцеся, нахіляецеся або паднімаеце руку, а стан здаецца танчэйшым. Мінус — ззаду фігура выглядае плоскай. Каб гэтага пазбегнуць, выбіраем джынсы з V-падобнай какеткай і высока размешчанымі кішэнямі.

ШТУЧНЫЯ МЕХ І СКУРА: УСЕ КОЛЕРЫ І АДЦЕННІ

Штучныя мех і скура як ніколі актуальныя ў гэтым сезоне. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць ствараць з гэтых матэрыялаў вырабы, якія будуць саграваць не горш і насіцца гэтак жа доўга, як іх натуральныя аналагі. Галоўнае — памятаць, што насіць штучны мех трэба менавіта як штучны (а не як падробку пад натуральны, бо на натуральны грошай не хапіла). Тое ж самае датычыцца і штучнай скуры. Тым больш што эка-матэрыялы даюць дызайнерам неабмежаваную прастору ў выбары колераў і адценняў. Стылісты раяць маладым дзяўчатам не баяцца яркіх і сакавітых тонаў, а больш дарослым — спыніцца на пастэльнай гаме. Са спіса актуальных колераў (цёплыя персікавыя адценні, пастэльны ружовы, малочныя тоны, колер слановай косці і г. д.) для нашай слотнай восені і зімы больш за ўсё падыдзе карычневая гама. Што да крою, fashion-блогеры рэкамендуюць выбіраць футравыя паліто зноў жа крою oversize.

АСІМЕТРЫЯ: УВЕСЬ СВЕТ — ТЭАТР

Асіметрыя — адзін з галоўных трэндаў надыходзячай восені. Не так даўно гэта была толькі падыумная тэндэнцыя, любімая такімі майстрамі, як Chloé, Alexander McQueen, Christian Dior, Prada, Givenchy, Lanvin, але нягледзячы на некаторую вычварнасць і тэатральнасць, асіметрыя раптам выйшла з подыумаў на вуліцы гарадоў — і прыжылася ў паўсядзённых вобразах. Праўда, амаль страціўшы сваю тэатральнасць. Актуальныя спадніцы з запахам — гэта таксама асіметрыя. А гэтай восенню некаторыя стылісты рэкамендуюць выбраць і трэнч з асіметрычным кроем. Зразумела, што калі плашч вы купляеце адзін на ўсе выпадкі жыцця, то лепш прытрымлівацца класікі. Але калі з фінансамі справы ідуць лепш, можаце паспрабаваць набыць у якасці яшчэ адной адзінкі верхняга адзення і такую стыльную штучку.

ЗБІРАЕМ ВОСЕНЬСКУЮ КАПСУЛУ

• Пачніце з трэнча. Гэтай восенню нават не глядзіце ў бок кароткіх мадэляў. Правільная даўжыня — мідзі.

• Купіце правільнае базавае паліто з выразнай лініяй пляча і якасным кроем — і яно стане асновай вашага гардэробу з кастрычніка да сакавіка. Паліто збярэ вобраз, зробіць яго завершаным, а постаць — падцягнутай. Актуальныя сілуэты — прамы класічны, кокан.

• Адмоўцеся ад любімага нашымі дамамі чорнага колеру. Не трэба папаўняць восеньска-зімовы гардэроб чорнымі рэчамі — яны стараць, выглядаюць панура, уганяюць у дэпрэсію і наогул неактуальныя. Альтэрнатыва чорнаму — цёмна-сіні, марсала, глыбокі смарагдавы, графітавы, хакі і «новы чорны» — карычневы ва ўсёй шыраце сваіх адценняў.

• Касуха — гэта новая класіка. У гэтым сезоне яна падоўжаная і трохі аверсайз: жаночая касуха ў ідэале павінна выглядаць як бы з мужчынскага пляча. Даўжыня — да тазавай косці, а лепш — трохі даўжэйшая. Дарэчы, касуха актуальная якраз у класічным чорным колеры.

• Куртка-кашуля ўпэўнена трымае свае пазіцыі. Выдатны варыянт, калі вы маладая — у першую чаргу душой (а маладосць душы да ўзросту дачынення не мае).

• Збіраючы капсулу, аддайце ўвагу разнастайнасці тэкстур. Восенню і зімой стылісты раяць міксаваць у адным луку розныя фактуры вырабаў: дэнім і вязаныя рэчы, кашамір і эка-скуру ды г. д.

• Джынсы заўсёды ў модзе, але ў гэтым сезоне больш актуальныя будуць штаны. На восень выбіраем штаны з натуральных тканін, з высокай пасадкай, зашчыпамі на талііі або разрэзамі наперадзе. Але і класічны крой «як ад мужчынскага касцюма» таксама ніхто не адменяў.

• Дарэчы, пра касцюмы. Яны — must have гэтай восені. Актуальныя трохі аверсайзныя мадэлі, а каб касцюм не выглядаў мешкавата, і штаны, і пінжак павінны добра трымаць форму.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

БРУСЕЛЬСКІ ТУПІК

Чаму ў Бельгіі зацягнуўся дзяржаўны крызіс?

У Бельгіі праваліліся перамовы аб стварэнні кіруючай кааліцыі, якія павінны былі прывесці да фарміравання паўнавартаснага ўрада — завяршэння палітычнага крызісу, які доўжыцца ў краіне больш за 600 дзён. Як паведаміла Le Soir, лідары дзвюх найбольш папулярных партый краіны — кіраўнік «Новага фламандскага альянсу» (НФП) Барт дэ Вевер і старшыня Сацыялістычнай партыі Поль Магнет — больш чым тры тыдні вялі перамовы з іншымі парламенцкімі партыямі, каб сфарміраваць новую адміністрацыю. Аднак належнага выніку дасягнуць так і не ўдалося, таму дэ Вевер і Магнет паведамілі каралю Бельгіі Філіпу аб правале. Чаму ў краіне зацягнуўся дзяржаўны крызіс?

ЧАСОВЫ ЎРАД

Напрыканцы ліпеня бельгійскі манарх запатрабаваў ад НФП і сацыялістаў пачаць перамовы з іншымі партыямі, паколькі іх мандатаў у парламенце не хапіла для фарміравання кааліцыі большасці. Па выніках леташніх выбараў гэтыя сілы атрымалі 45 са 150 месцаў, таму ім патрабавалася падтрымка як мінімум яшчэ адной больш-менш буйной партыі.

Правал перамоў азнаменаваў працяг палітычнага крызісу, з-за якога ўрад не валодае ўсімі паўнамоцтвамі і знаходзіцца ў статусе часовага. Па сутнасці, улады могуць прымаць рашэнні толькі па руцінных або неадкладных пытаннях, але ніяк не могуць уплываць на дзяржаўныя выдаткі, адзначае gazeta.ru.

Крызіс у Бельгіі пачаўся роўна 610 дзён таму (рэкордны для найноўшай сусветнай палітыкі тэрмін) — 21 снежня 2018 года, калі ўрад краіны на чале з тагачасным прэм'ерам Шарлем Мішэлем ад рэфармісцкага руху сышоў у адстаўку і дагэтуль знаходзіцца ў статусе часовага. Прычынай такой сітуацыі стаў выхад «Нацыянальнага фламандскага альянсу» з кіруючай кааліцыі на фоне рознагалоссяў з урадам па пытанні міграцыі — Мішэль падтрымаў міграцыйны пакт ААН, што сур'ёзна разлавала фламандскіх нацыяналістаў.

ФЛАМАНДЦЫ І ВАЛОНЫ

Галоўнай перашкодай застаецца сур'ёзная неаднастайнасць унутры дзяржавы. Справа ў тым, што ў Бельгіі існуе тры групы выбаршчыкаў, падзеленыя па моўных і культурных прынцыпах, — фламандцы, валоны і нямецкамоўная супольнасць. Асноўны ўплыў на палітычнае жыццё каралеўства аказваюць прадстаўнікі першых дзвюх груп, як найбольш шматлікіх.

Адлік сваёй сучаснай гісторыі Бельгія бярэ з 1830 года, калі ў адзіную дзяржаву аб'ядналіся франкамоўныя валоны, нідэрландамоўныя фламандцы і невялікая нямецкая суполка рэгіёна Ойпен-Мальмедзі. Хуткае эканамічнае развіццё Валоніі — перш за ўсё, у металургіі і здабычы вугалю, — і адносная адсталасць сельскагаспадарчай Фландрыі зрабілі валонаў па сутнасці тытульнай нацыяй каралеўства. Аднак з сярэдзіны мінулага стагоддзя сітуацыя карэнным чынам пачынае змяняцца. Эканоміка Валоніі паступова прыходзіць у заняпад, чаму шмат у чым спрыяла страта Бельгіяй яе найважнейшай афрыканскай калоніі — Конга. Фландрыя становіцца прагрэсіўным рэгіёнам, дзе актыўна развіваюцца найноўшыя тэхналогіі, а яе галоўны горад Антверпен ператвараецца ў буйны марскі порт еўрапейскага кантынента. Да пачатку XXI стагоддзя эканоміка Фландрыі дае львіную долю паступленняў у нацыянальны бюджэт, і, як лічаць фламандскія палітыкі, фактычна ўтрымлівае эканамічна і сацыяльна аслабленую франкамоўную частку каралеўства.

Пэўныя супярэчнасці паміж фламандцамі і валонамі адбіваюцца на парламенцкіх партыях, якія прадстаўляюць інтарэсы тых ці іншых выбаршчыкаў. Яны разыходзяцца ледзьве не па ўсіх ключавых аспектах, сярод якіх — міграцыя, пенсіі, падаткі або нават пытанні клімату. Як заўважыў gazeta.ru кіраўнік Цэнтра французскіх даследаванняў Інстытута Еўропы РАН Юрый Рубінскі, Бельгія з вялікімі цяжкасцямі пераадольвае гэтыя супярэчнасці. «Нельга сказаць, што краіна знаходзіцца на мяжы краху. Нейкім чынам яны спраўляюцца з гэтым крызісам, але цяпер гэта зайшло занадта далёка», — дадаў эксперт.

У ПОШУКАХ ЗГОДЫ

Парламенцкія выбары мінулага года, як чакалася, павінны былі згладзіць асноўныя моманты, але ў выніку згоды ў парламенце дасягнуць не ўдалося. Фарміраванню кааліцыі не дапамагла нават змена прэм'ера, калі летась у кастрычніку часовы ўрад узначаліла Сафі Вільмес ад рэфармістаў. Яна змяніла Шарля Мішэля, які заняў пасаду старшыні Еўрапейскага савета.

Па меркаванні Le Soir, правал кааліцыйных перамоў, хутчэй за ўсё, прывядзе да прызначэння пазачарговых выбараў — верагодна, яны выпадуць на восень, калі скончацца паўнамоцтвы часовага ўрада. Аднак наўрад ці змогуць прывесці да завяршэння палітычнага крызісу.

Улічваючы, што цяпер часовы ўрад складаецца з прадстаўнікоў рэфармістаў, хрысціянскіх дэмакратаў і фламандскіх лібералаў, шанцаў сфарміраваць большасць без падтрымкі іншых партый у іх няма. Правыя разам з сацыялістамі могуць набраць 65 мандатаў, ім таксама не хопіць месцаў для фарміравання кааліцыі большасці. Такім чынам, чарговыя выбары стануць толькі новым вітком крызісу, хоць дзяржава і так ужо амаль два гады функцыянуе без паўнавартаснага ўрада.

ПАРАДАКСАЛЬНАЯ З'ЯВА

Адной з галоўных праблем Бельгіі з'яўляюцца сацыяльныя пытанні, якія ўсё больш абвастраюцца без палітычнага вырашэння. Ключавымі тэмамі мінулых парламенцкіх выбараў сталі пенсіі, праблемы клімату і бяспека каралеўства, адзначыла Politico, і яны дагэтуль не страчваюць сваёй актуальнасці. Урада, здольнага выканаць дадзеныя народу абяцанні, проста няма, і гэта праяўляецца ва ўсіх сферах. Напрыклад, парламент Бельгіі ўжо тры гады не галасаваў за паўнавартасны праект бюджэту.

Тым не менш гэта не значыць, што грошы ні на што не выдзяляюцца: улады паспяхова ўзгаднілі антыкрызісны пакет на 124 мільёны еўра падчас пандэміі, а таксама план павышэння пенсій аб'ёмам €200 млн. Аднак гэта толькі кропкавыя рашэнні, якія не дазваляюць вырашыць праблемы ў цэлым. Акрамя таго, чым даўжэй існуе часовы ўрад, тым больш пытанняў паўстане перад паўнавартасным кабмінам — у прыватнасці, трэба выправіць дэфіцыт бюджэту ў €52,8 млрд — адно з наступстваў пандэміі COVID-19.

Адсюль выцякае другі негатыўны момант — Бельгія дасюль не прыступіла да аднаўлення эканомікі пасля эпідэміі. Для гэтага неабходна прыняць адпаведную рэформу, але адсутнасць падтрымкі ў парламенце не дае ажыццявіць гэтую задачу. Часткова сітуацыю згладжваюць рэгіянальныя ўлады, але без каардынацыі федэральнага ўрада зноў-такі няма паўнавартаснага рашэння праблемы.

Зрэшты, Юрый Рубінскі нагадвае, што Брусель не ўпершыню сутыкаецца з палітычным крызісам падобнага роду — мінулы раз часовы ўрад функцыянаваў у каралеўстве на працягу 589 дзён — з красавіка 2010-га да снежня 2011 года. «Адсутнасць цэнтральнага ўрада ў Бельгіі — дзіўная і парадаксальная з'ява, але ўсё ж казаць пра развал ці параліч дзяржавы не варта», — рэзюмаваў эксперт.

ХТО ЗАПЛАЦІЦЬ ЗА КАРАНЦІН?

У Бельгіі пандэмія пагоршыла і без таго напоўненыя супярэчнасцямі адносіны паміж нідэрландамоўнымі паўночнікамі і франкамоўнымі паўднёўцамі — падставай для спрэчак сталі метады выхаду з каранціну і аднаўлення эканомікі. Прадстаўнік «Новага фламандскага альянсу» Пітэр дэ Рувер, адказваючы на пытанне аб тым, хто будзе плаціць за каранцін, наўпрост заявіў — фламандская поўнач. «Гаворка ідзе пра тое, хто атрымлівае грошы, а хто выпісвае чэк на гэтыя грошы, — дадаў дэ Рувер. — У апошнія тыдні фламандскі ўрад настойваў на паразапуску эканомікі, тады як левыя былі больш асцярожныя. Гэта не супадзенне. Занятасць у прыватным сектары вышэйшая ў Фландрыі. Калі мы пачнём абкладаць падаткам багатых для падтрымкі бяздзейнасці, гэта будзе дадатковы трансфер з поўначы на поўдзень».

Пандэмія каранавіруса агаліла прабелы ў дзяржаўным кіраванні. Сістэма аховы здароўя падзелена паміж федэральным і рэгіянальнымі ўрадамі, што толькі ўскладніла рэгуляванне нават самых простых пытанняў. Менавіта на гэтую праблему паказваюць нацыяналісты, што робіць актуальным іх заклік да стварэння канфедэрацыі.

«Падзел уладаў у Бельгіі — гэта рататуй, — вобразна заявіў у парламенце Пітэр дэ Рувер. — Гэта прыводзіць да неэфектыўнасці. Крызіс толькі пацвердзіў тое, што мы казалі гадамі: структура краіны занадта складаная».

Поўнач і поўдзень ужо спрачаліся аб тым, як справіцца з крызісам у пачатку пандэміі. Апошнія заклікалі ўзяць на ўзбраенне прыклад Францыі — увесці жорсткі каранцін як мага раней. Паўночнікі, чыя эканоміка больш чым у два разы перавышае эканоміку Валоніі, не жадалі спяшацца. Новыя выбары ўяўляюць небяспеку для «Новага фламандскага альянсу», паколькі сур'ёзную канкурэнцыю на мінулых выбарах ім склалі вельмі правыя з «Фламандскага інтарэсу». Аднак сацыялісты наўрад ці пойдуць на саступкі ў такім важным пытанні як дзяржаўны лад.

Супярэчнасці паміж бакамі выклікалі нават самыя дробязныя пытанні. Так, поўдзень і поўнач спрачаліся з-за... вылучэння часткі галоўнай дарогі ў цэнтры Бруселя пад веласіпедную паласу. Для Тэа Франкена, аднаго з членаў кіраўніцтва «Новага фламандскага альянсу» гэты крок стаў падставай для заяў аб тым, што краіна развальваецца. Ён сцвярджаў, што веласіпедная паласа дыскрымінавала 300 тысяч жыхароў Фландрыі, якія штодня ездзяць у Брусель на аўтамабілях. Франкен заяўляў, што веласіпедная дарожка пагоршыць разрыў паміж Фландрыяй і Бруселем. «Рана ці позна гэта прывядзе да разрыву», — заўважыў палітык. Раней ён заявіў, што падаўжэнне дыстанцыйнай работы паглыбіць раскол з Бруселем. «Можа быць, мы павінны дазволіць гэтаму здарыцца. Пакуль, Бельгія», — напісаў палітык у сваім Twitter.

Лідар «Новага фламандскага альянсу» называе ўрад Бельгіі «інвалідам». «Гэтая краіна вельмі складаная з яе раздробненымі паўнамоцтвамі, — заявіў Барт дэ Вевер на нацыянальным тэлебачанні. — Давайце выкарыстоўваць крызіс каранавіруса для стварэння новай Бельгіі. Бельгіі 2.0».

Поўдзень не бачыць сэнсу ў стварэнні канфедэрацыі, што, на думку сацыялістаў, толькі павялічыць разыходжанні. Аднак бакам неабходна прыйсці да згоды — іншага выйсця з крызісу няма.

Захар БУРАК.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ ВТОРОГО ВЫПУСКА Общества с ограниченной ответственностью «ПриватКапитал»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

На русском языке:

полное — общество с ограниченной ответственностью «ПриватКапитал» (далее – Эмитент);

сокращенное — ООО «ПриватКапитал».

На белорусском языке:

полное — Таварыства з абмежаваній адказнасцю «ПрыватКапітал»;

сокращенное — ТАА «ПрыватКапітал».

2. Место нахождения Эмитента, номер телефона и факса, электронный адрес (e-mail):

Республика Беларусь, 223053, Минская область, Минский район, район деревни Боровая 1, главный корпус, кабинет 503/29-2, телефон +375 (29) 5005009, факс +375 (17) 3284528, e-mail: privat_office@mail.ru.

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 30 сентября 2015 года за № 192542737.

4. Основным видом деятельности Эмитента является сдача внаем собственного и арендуемого недвижимого имущества.

5. Денежные средства, поступающие при размещении облигаций Эмитента второго выпуска, будут зачисляться, в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в безналичном порядке на текущие (расчетные) банковские счета Эмитента:

в белорусских рублях № BY46BPSB30121754850139330000 в открытом акционерном обществе «БПС-Сбербанк» БИК BPSBBY2X;

в долларах США №BY43BPSB30121754850268400000 в открытом акционерном обществе «БПС-Сбербанк» БИК BPSBBY2X.

6. Наименование депозитария, обслуживающего Эмитента, его место нахождения, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам:

Общество с ограниченной ответственностью «Ласерта» (далее – Депозитарий Эмитента) зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Минским городским исполнительным комитетом 29.06.2001 за № 101275094, код – D23.

Место нахождения: Республика Беларусь, 220062, г. Минск, пр-т Победителей, д. 121, пом. 61, тел./факс 8017 224 74 79, e-mail: info@lacerta.by, официальный сайт www.lacerta.by.

Специальное разрешение (лицензия) № 02200/5200-124-1123 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам выдано Министерством финансов Республики Беларусь.

7. Решение о втором выпуске облигаций Эмитента принято и утверждено единственным участником Эмитента 07.07.2020 года (Решение № 7).

8. Облигации второго выпуска – именные, процентные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равные объем и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска облигаций независимо от времени приобретения (далее в настоящем документе совокупно именуемые «Облигации»).

Объем выпуска Облигаций – 1 500 000 (один миллион пятьсот тысяч) долларов США.

Количество Облигаций – 30 000 (тридцать тысяч) штук.

Номинальная стоимость Облигации – 50 (пятьдесят) долларов США.

9. Эмитент осуществляет эмиссию необеспеченных Облигаций без учета положений, предусмотренных подпунктом 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» (далее – Указ № 277), в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа № 277.

10. Размещение Облигаций осуществляется после регистрации Проспекта эмиссии Облигаций второго выпуска (далее – Проспект эмиссии), заверения Краткой информации об эмиссии Облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (далее – Регистрирующий орган) и ее раскрытия на Едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс), публикации в газете «Звязда».

Дата начала размещения Облигаций – 24 августа 2020 года. Дата окончания размещения Облигаций – 4 августа 2025 года.

Срок размещения Облигаций может быть сокращен в случае полной реализации всего объема выпуска Облигаций.

11. Размещение Облигаций осуществляется путем открытой продажи на неорганизованном рынке в период, указанный в части второй пункта 10 настоящего документа.

Проведение открытой продажи Облигаций на неорганизованном рынке осуществляется Эмитентом:

- по адресу Эмитента, указанному в пункте 2 настоящего документа, ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь (далее – нерабочие дни)), с 9.00 до 17.00;

- посредством Мобильного приложения ООО «Ласерта» – Lacerta (далее – Мобильное приложение) – круглосуточно. ООО «Ласерта» на основании договора оказания услуг размещает информацию об Облигациях Эмитента в Мобильном приложении. Подключение физических лиц к Мобильному приложению осуществляется ежедневно (за исключением нерабочих дней) с учетом регламента работы ООО «Ласерта» по адресу: Республика Беларусь, 220062, г. Минск, пр-т Победителей, д. 121, пом. 61. С регламентом работы ООО «Ласерта» можно ознакомиться на официальном сайте: www.lacerta.by.

ООО «Ласерта» предоставляет физическим лицам (резидентам Республики Беларусь) – пользователям Мобильного приложения – возможность приобретения Облигаций через Мобильное приложение посредством подачи поручения на покупку ценных бумаг Эмитента непосредственно ООО «Ласерта», как Брокеру, на основании договора на комплексное брокерское обслуживание.

Поручение на покупку Облигаций, поданное посредством Мобильного приложения в нерабочие дни, исполняется Брокером в первый рабочий день по текущей стоимости, рассчитанной на день подачи поручения на покупку Облигаций. Договор купли-продажи (первичного размещения) Облигаций заключается Эмитентом и Брокером в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Начисление постоянного процентного дохода (далее – доход) владельцу Облигаций начинается со дня, следующего за днем подачи поручения на покупку Облигаций посредством Мобильного приложения.

Проведение открытой продажи Облигаций на неорганизованном рынке также осуществляется профессиональным участником рынка ценных бумаг ООО «Ласерта» по поручению Эмитента, ежедневно (за исключением нерабочих дней) с учетом регламента работы ООО «Ласерта» по адресу: Республика Беларусь, 220062, г. Минск, пр-т Победителей, д. 121, пом. 61.

12. Срок обращения Облигаций – 1826 календарных дней (с 24.08.2020 г. по 24.08.2025 г.). Для расчета срока обращения Облигаций день начала размещения и день начала погашения Облигаций считаются одним днем.

13. В дату начала открытой продажи Облигаций (24.08.2020 г.), а также в даты выплаты процентного дохода Облигации размещаются по номинальной стоимости.

В иные дни проведения открытой продажи Облигации размещаются по цене, равной текущей стоимости Облигаций.

Перечисление денежных средств в оплату стоимости размещаемых Облигаций осуществляется в безналичном порядке в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь. В случае оплаты стоимости размещаемых Облигаций в белорусских рублях, перечисление осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату совершения сделки. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации, в соответствии с правилами математического округления, с точностью до целой белорусской копейки.

14. По Облигациям установлен постоянный процентный доход, выплачиваемый периодически в течение срока обращения Облигаций по ставке ***9 (девять)*** процентов годовых.

15. Выплата суммы дохода по Облигациям может быть организована через Депозитарий Эмитента в соответствии с договором на депозитарное обслуживание Эмитента. Выплата дохода владельцам Облигаций производится:

в даты выплаты дохода;

на основании реестра владельцев Облигаций, сформированного Депозитарием Эмитента для целей выплаты дохода;

путем перечисления Эмитентом либо Депозитарием Эмитента в безналичном порядке, в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь, причитающейся суммы денежных средств на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае выплаты суммы дохода по Облигациям в белорусских рублях выплата осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату выплаты дохода по Облигациям. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации, в соответствии с правилами математического округления, с точностью до целой белорусской копейки.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах владельцев Облигаций, а также в случае, если реестр владельцев Облигаций содержит ошибочные банковские реквизиты, подлежащая выплате сумма резервируется на счете Эмитента, а затем выплачивается после письменного обращения владельца Облигаций к Эмитенту. Доход на зарезервированную сумму не начисляется и не выплачивается.

16. В период обращения Облигаций Эмитент вправе по собственной инициативе принять решение о досрочном погашении данного выпуска Облигаций либо его части до даты окончания срока обращения выпуска Облигаций.

Кроме того, Эмитент осуществляет досрочное погашение Облигаций настоящего выпуска или его части в случае, установленном законодательством Республики Беларусь, при невозможности предоставления обеспечения.

В случае принятия решения о досрочном погашении части данного выпуска Облигаций, находящихся в обращении, досрочное погашение осуществляется каждому владельцу Облигаций пропорционально количеству принадлежащих ему Облигаций. Расчет количества досрочно погашаемых Облигаций осуществляется с округлением до целого числа в соответствии с правилами математического округления.

Выплата денежных средств при досрочном погашении Облигаций может быть организована через Депозитарий Эмитента в соответствии с договором на депозитарное обслуживание Эмитента.

Досрочное погашение осуществляется:

- в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, который формируется Депозитарием Эмитента за 3 (три) рабочих дня до установленной даты досрочного погашения Облигаций;

- путем перечисления Эмитентом или Депозитарием Эмитента в безналичном порядке причитающейся суммы денежных средств, в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь, на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае выплаты денежных средств, причитающихся при досрочном погашении, в белорусских рублях, выплата осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату досрочного погашения Облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации, в соответствии с правилами математического округления, с точностью до целой белорусской копейки.

17. В соответствии с законодательством Республики Беларусь владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод досрочно погашаемых Облигаций на счет «депо» Эмитента не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Эмитентом денежных средств, необходимых для досрочного погашения Облигаций.

В случае несвоевременного перевода досрочно погашаемых Облигаций на счет «депо» Эмитента владелец Облигаций уплачивает пеню в размере 0,1% от суммы, перечисленной Эмитентом при досрочном погашении Облигаций, за каждый календарный день просрочки перевода Облигаций на счет «депо» Эмитента.

18. Дата начала погашения Облигаций – 24.08.2025 г. Дата начала погашения Облигаций совпадает с датой окончания погашения Облигаций.

19. Для целей погашения Облигаций Депозитарий Эмитента формирует реестр владельцев Облигаций по состоянию на 20.08.2025 г.

Для своевременного формирования Депозитарием Эмитента реестра владельцев Облигаций обращение Облигаций прекращается за 3 (три) рабочих дня до даты начала их погашения (досрочного погашения).

При погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается номинальная стоимость Облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иной неполученный доход – при наличии).

Выплата денежных средств при погашении Облигаций может быть организована через Депозитарий Эмитента в соответствии с договором на депозитарное обслуживание Эмитента.

20. Погашение Облигаций осуществляется:

в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, сформированном Депозитарием Эмитента на дату, указанную в части первой пункта 19 настоящего документа;

путем перечисления Эмитентом или Депозитарием Эмитента в безналичном порядке причитающейся суммы денежных средств, в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь, на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае выплаты денежных средств, причитающихся при погашении, в белорусских рублях, выплата осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату начала погашения Облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации с точностью до целой белорусской копейки в соответствии с правилами математического округления.

В соответствии с законодательством Республики Беларусь владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод погашаемых Облигаций на счет «депо» Эмитента не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Эмитентом денежных средств, необходимых для погашения Облигаций.

В случае несвоевременного перевода погашаемых Облигаций на счет «депо» Эмитента владелец Облигаций уплачивает пеню в размере 0,1 % от суммы, перечисленной Эмитентом при погашении Облигаций, за каждый календарный день просрочки перевода Облигаций на счет «депо» Эмитента.

21. В период обращения Облигаций Эмитент обязуется осуществлять приобретение размещенных Облигаций до даты начала их погашения с возможностью их последующего обращения или досрочного погашения (далее – досрочный выкуп Облигаций) по номинальной стоимости Облигаций в следующие даты: 24.08.2022 г., 24.08.2023 г., 24.08.2024 г. – у любого их владельца на неорганизованном рынке. Если установленная дата выкупа выпадает на нерабочий день, выкуп Облигаций Эмитентом осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по текущей стоимости Облигаций.

Перечисление денежных средств осуществляется в безналичном порядке, в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь, на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае выплаты денежных средств, причитающихся при досрочном выкупе, в белорусских рублях, выплата осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату выкупа Облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации, в соответствии с правилами математического округления, с точностью до целой белорусской копейки.

22. В случае запрещения эмиссии Облигаций, признания республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг (далее – Регулирующий орган), выпуска Облигаций недействительным Эмитент:

возвращает владельцам Облигаций средства, полученные в оплату Облигаций, а также начисленный по этим Облигациям доход в месячный срок с даты признания выпуска Облигаций недействительным, запрещения эмиссии Облигаций. При этом все Облигации второго выпуска подлежат изъятию из обращения;

письменно уведомляет Регулирующий орган о возврате указанных средств владельцам Облигаций в полном объеме.

Возврат денежных средств осуществляется путем перечисления Эмитентом в безналичном порядке причитающейся суммы денежных средств, в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь, на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае возврата денежных средств при запрещении эмиссии Облигаций, признании выпуска Облигаций недействительным, в белорусских рублях, возврат осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату возврата. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации, в соответствии с правилами математического округления, с точностью до целой белорусской копейки.

23. Дата государственной регистрации выпуска Облигаций и государственный регистрационный номер выпуска Облигаций:

(заполняется Регистрирующим органом)

17 августа 2020 года, № 6-236-02-4119.

